ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

НАСТАЎНІЦКАЯ газета

№ 13(5195)
Чацвер,
1 лютага
2001 года

Выходзіць з 20 снежня 1945 года

Кошт у розніцу — 48 руб.

Паведамляе прэс-цэнтр Міністэрства адукацыі

Што, дзе, калі адбудзецца ў лютым

6—8 лютага ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце адбудзецца міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Куляшоўскія чытанні".
Тэл. у г. Магілёве: (8-0222) 26-42-71, 26-30-72.

10 — 11 лютага Галоўнае ўпраўленне сацыяльнай і выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі сумесна з Беларускім таварыствам Чырвонага Крыжа ў гасцінічным комплексе Мінскага трактарнага завода праводзяць рэспубліканскі семінар настаўнікаў школ і ПТВ "Вывучаючы міжнароднае гуманітарнае права". Пачатак у 10.00.
Тэл. 220-31-87.

10 — 11 лютага каманды Нацыянальнага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі будуць прымаць удзел у рэспубліканскім чэмпіянаце па інтэлектуальных гульнях, які пройдзе ў Магілёве.
Тэл. 227-12-84.

12 — 14 лютага ў Рэспубліканскім цэнтры тэхнічнай творчасці навучэнцаў (вул. Макаёнка, 12) адбудзецца рэспубліканскі семінар па сучасных камп'ютэрных тэхналогіях і лічбавай фатаграфіі.
Тэл. 264-62-72.

13 — 14 лютага ў Беларускім завочным сельскагаспадарчым тэхнікуме (г.п. Смілавічы, Чжрвеньскі раён, Мінская вобласць) праводзіцца рэспубліканскі круглы стол па праблеме "Бесперапынныя формы адукацыі ў сістэме сярэдняй спецыяльнай адукацыі".
Тэл. у Смілавічах: 5-21-38; у Мінску: 220-19-86.

13—15 лютага ў Акадэміі паслядыпломнай адукацыі адбудзецца рэспубліканскі семінар "Актуальныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы і літаратуры ў агульнаадукацыйнай школе".
Тэл. 222-64-92.

З **13 па 17 лютага** на базе гімназіі № 1 г. Дзяржынска праводзіцца рэспубліканскі турнір юных фізікаў.
Тэл. 220-98-39.

14 лютага Нацыянальны цэнтр творчасці дзяцей і моладзі (вул. Кірава, 14) праводзіць дабрачынную акцыю для дзяцей воінаў-афганцаў.
Тэл. 227-12-84.

20 лютага ў Рэспубліканскім экалагічным цэнтры навучэнцаў (вул. Макаёнка, 8) адкрыецца рэспубліканская персанальная выстава работ вучняў сярэдняй школы № 2 Барысава і сярэдняй школы № 21 Магілёва.
Тэл. 264-87-28.

20 — 22 лютага ў Нацыянальным цэнтры творчасці дзяцей і моладзі (вул. Кірава, 14) адбудзецца рэспубліканскі семінар метадыстаў пазашкольных устаноў і лідэраў дзіцячых, маладзёжных, грамадскіх аб'яднанняў "Выхаваўчыя магчымасці дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў: вопыт і перспектывы".
Тэл. 227-12-84.

20 — 23 лютага на базе Гродзенскага педагагічнага вучылішча праводзіцца рэспубліканская алімпіяда прафесійнага майстэрства па спецыяльнасці "Музыка і спевы" (рэспубліканскі тур).
Тэл. у Гродна: 72-26-60, 72-11-26.

20 — 23 лютага ў Брэсцкім абласным цэнтры маладзёжнай творчасці адбудзецца XII рэспубліканская канферэнцыя навуковых біялагічных аб'яднанняў навучэнцаў і прэзентацыя навуковых біёлага-экалагічных работ навучэнцаў.
Тэл. 264-87-28.

22 лютага Упраўленне дашкольнага выхавання Міністэрства адукацыі сумесна з Міністэрствам аховы здароўя праводзяць у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі рэспубліканскую нараду-семінар па ўдасканаленні харчавання дзяцей у дашкольных дзіцячых установах.
Тэл. 222-65-69.

23 — 25 лютага ў Рэспубліканскім цэнтры тэхнічнай творчасці навучэнцаў (вул. Макаёнка, 12) пройдуць рэспубліканскія спаборніцтвы навучэнцаў па мадэлях паветранага бою на кубак РЦТТН.
Тэл. 264-62-72.

22 — 26 лютага 120 навучэнцаў з усіх абласцей рэспублікі прымуць удзел у першынстве рэспублікі па скалалазанні ў залах, якое будзе праходзіць у залах абласнога спартыўнага камітэта і на станцыі турыстаў г.Гомеля.
Тэл. у Мінску: 262-54-21, 262-54-19.

Акадэмія паслядыпломнай адукацыі праводзіць мэтавыя курсы кіраўнікоў, спецыялістаў упраўленняў адукацыі аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама, ІПК "Абнаўленне кіравання адукацыйнымі ўстановамі вялікага горада: тэхналогіі кіраўніцкай дзейнасці"; аўтарскія курсы доктара філасофскіх навук, прафесара Я.В.Петушковай і кандыдата філалагічных навук, дацэнта І.І.Крука "Сучасныя цывілізацыйныя трансфармацыі і каштоўнасці сацыякультурнай антрапалогіі: урокі і гістарычныя перспектывы", І этап; аўтарскія курсы "Майстар-клас" старшага выкладчыка кафедры замежных моў В.І.Катаева "Мультымедыйныя тэхналогіі ў вывучэнні замежных моў", II этап; курсы дапрафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў устаноў адукацыі "Асновы прафесійнай дзейнасці сацыяльных педагогаў".
Тэл. 285-78-51, 285-78-30, 285-78-46.

Разам з лялькамі

Уласны лялечны тэатр з'явіўся ў дзяцей, якія наведваюць яслі-сад № 83 Віцебска. Трынаццаць вялікіх тэатральных лялек і шаснаццаць лялек-бібаба (іх надзяваюць на рукі) прапісаліся тут. Грошы на пакупку лялек сабралі не толькі бацькі дзяцей, але і работнікі дашкольнай установы. Разам з лялькамі набыты таксама тэатры "Церамок", "Калабок", "Бураціна", "Чырвоная шапачка".

НА ЗДЫМКУ: кіраўнік гуртка Вольга Буката з юнымі лялечнікамі.

Фота Аляксандра ХІТРОВА, БЕЛТА.

Дзеля інтарэсаў вучняў

Самая прыдзірлівая і строгая камісія не можа зрабіць заўвагі наконт арганізацыі харчавання школьнікаў у Чырвонаазоркаўскай сярэдняй школе Клецкага раёна. І ў гэтым вялікая заслуга базавага прадпрыемства навучальнай установы — знакамітага ў краіне племсаўгаса "Чырвоная Зорка".

Як паведаміў дырэктар школы Мікалай Мамчыц, гаспадарка ўзяла на сябе клопат па забеспячэнню школьнай сталовай гароднінай, бульбай. Прычым бясплатна.

А як з мясам? У раёне, расказаў Мікалай Мікалаевіч, склалася практыка пастаўкі гавядзіны і свініны па цэнах, якія ў паўтара-два разы ніжэй за магазінныя. У выніку гэта адчувальна адбіваецца на кошце абедаў. У залежнасці ад меню ён складае 130 — 170 рублёў.

Паўнацэннае трохразовае харчаванне атрымліваюць падрыхтоўчая група, дзяўчынкі і хлопчыкі, якія займаюцца ў групе прадоўжанага дня.

Адпрацавана практыка падвозу вучняў у школу з вёскі Цапра. Штодзённа саўгасны аўтобус у вызначаны час вязе іх у школу і пасля заняткаў адвозіць дамоў.

Наш кар.

Увага, конкурс!

У красавіку 2001 года Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі ладзіць незвычайную выставу — "Свет вачыма беларускіх дзяцей XX стагоддзя". На ёй будуць прадстаўлены творы дзяцей мінулага стагоддзя ад першых яго гадоў да апошніх.

Музей і арганізацыйны камітэт выставы звяртаюцца да ўсіх, у каго захаваліся свае дзіцячыя малюнкі, малюнкі бацькоў, дзядоў, прадзедаў, родных і знаёмых, калі яны былі дзецьмі ці падлеткамі (да 17 гадоў уключна). Дасылайце ці прыносьце гэтыя творы да 20 лютага 2001 года ў Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі (220050, Мінск, вул. К.Маркса, 12). Захаванасць малюнкаў будзе гарантавана.

Да твораў неабходна прыкласці кароткую біяграфію і фотаздымак аўтара (пажадана часу стварэння малюнкаў).

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па тэлефонах: 206-33-17, 227-06-33, 227-30-06.

Пішыце ў сваю газету!

"Пра што б хацелася сказаць на II з'ездзе настаўнікаў Беларусі"

Паважаныя настаўнікі! У канцы чэрвеня мяркуецца правесці II з'езд настаўнікаў Беларусі. Вялікі педагагічны форум абмяркуе зробленае па абнаўленні сярэдняй агульнаадукацыйнай школы, вызначыць надзённыя задачы па ўдасканаленні сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі. Зразумела, што не кожны настаўнік будзе дэлегатам з'езда, але кожны з вас мае магчымасць выказаць свае думкі і прапановы ў "Настаўніцкай газеце".

Неўзабаве на старонках "НГ" з'явіцца новая рубрыка "Пра што б хацелася сказаць на II з'ездзе настаўнікаў Беларусі". Пішыце нам пра ўсё, што вас клапоціць і хвалюе, а таксама пра свой педагагічны вопыт. Чакаем вашых пісьмаў!

Новыя адукацыйныя тэхналогіі

Сістэмны падыход плюс якасць

Калі мы хочам паўплываць на вынікі работы нашай школы, мы перш за ўсё павінны паклапаціцца пра якасць работы настаўніка. А для гэтага трэба павысіць яго кампетэнтнасць у галіне тэорыі і практыкі вучэбных заняткаў, у галіне педагагічнага аналізу, фарміруючы ў яго сістэмнае бачанне, бо яно і ляжыць у аснове сучаснага стылю мыслення. Менавіта таму педагагічны калектыў нашай школы звярнуўся да вучэбнай тэхналогіі "Сістэмна-дзейнасны падыход да пабудовы і аналізу вучэбных заняткаў", асноўная мэта якой — пошук шляхоў узмацнення развіццёвай накіраванасці класна-ўрочнай сістэмы.

Гэтая тэхналогія дала магчымасць перш за ўсё асэнсаваць працэс навучання як дзейнасць, акцэнтуючы ўвагу на наступных момантах.

Па-першае, навучанне — гэта матываваны працэс, таму задача настаўніка заключаецца ў тым, каб уключаць кожнага вучня ў дзейнасць, якая забяспечвае фарміраванне і развіццё пазнавальных патрэбнасцей, якія пераходзяць у пазнавальныя матывы. Гэтаму працэсу садзейнічае ўсведамленне вучнем мэты дзейнасці. Ланцужок, па якім адбываецца гэты працэс, выглядае так: П (патрэбнасць) — М (матыў) — М (мэта) — Д (дзеянне) — Р (рэфлексія), бо без усведамлення і ацэнкі вынікаў самой дзейнасці, выяўлення памылак і прычын яна не забяспечыць патрэбнага ўзроўню дасягнення мэты.

Па-другое, паспяховасць навучання залежыць ад валодання вучнем неабходнымі ведамі і спосабамі дзейнасці, што патрабу ад настаўніка пошуку шляхоў пастаяннага развіцця агульных вучэбных уменняў.

Па-трэцяе, навучанне — гэта дзейнасць самакіруемая, і па-за гэтай пазіцыяй яна ажыццяўляцца не можа. Менавіта гэты момант патрабуе навучання вучня ўменню ацэньваць, аналізаваць сваю дзейнасць, яе вынікі і сябе ў гэтай дзейнасці.

Да найбольш важных вынікаў інавацыйнай дзейнасці педагагічнага калектыву нашай школы мы адносім і тое, што намецілася новая парадыгма настаўніцкага падыходу да пабудовы вучэбных заняткаў. Урок разглядаецца як складаная працэсуальная сістэма.

Што ж уяўляюць сабой яго структурныя элементы, якія дамінуюць сувязі паміж імі, што выступае ў якасці сістэмаўтваральнага кампанента і, урэшце, як лагічна могуць размяшчацца элементы ў вучэбных занятках?

Адказам на гэтыя пытанні стаў банк даных па тыпы вучэбных заняткаў. Гэта мадэлі зарыянтаў структуры пяці тыпаў вучэбных заняткаў, планы ўрокаў, якія адлюстроўваюць характарыстыку кожнага з яго этапаў і логіку працэсу засваення ведаў: успрыманне — асэнсаванне — запамінанне — прымяненне — абагульненне — рэфлексія.

Інавацыйная тэхналогія аказала таксама неацэнную дапамогу ў навучанні настаўнікаў і кіраўнікоў школы сістэмнаму падыходу да аналізу вучэбных заняткаў. Менавіта такі аналіз стаў адным з дзейсных шляхоў выяўлення найбольш тыповага ў вопыце настаўнікаў-наватараў і паказаў, што ўрок у іх з'яўляецца формай рэалізацыі ўсіх функцый працэсу навучання. Усе яны ўмела арганізуюць матываваную вучэбна-пазнавальную дзейнасць кожнага вучня. Якасць ведаў вучняў фарміруецца ў сістэме. У гэтай катэгорыі настаўнікаў урок сапраўды ўяўляе сабой цэласную сістэму за кошт граматнага вызначэння мэты, зместу, адбору метадаў і форм навучання. Яны ўмела звязваюць вывучэнне новага і кантроль за засваеннем матэрыялу, замацаванне і абагульненне, замацаванне і кантроль. Асабліва трэба падкрэсліць іх глыбокую павагу да асобы вучня.

Работа над тэхналогіяй сістэмна-дзейснаснага падыходу пераконвае нас у тым, што вучэбныя заняткі (пры ўсіх педагагічных тэхналогіях) з'яўляюцца асноўнай формай навучальнага працэсу. Таму перш чым асвойваць новую педагагічную тэхналогію, трэба авалодаць тэорыяй і перадавым вопытам прымянення гэтай тэхналогіі, якая рэалізуецца праз класна-ўрочную сістэму.

Алена СУЕЦІНА,
намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце сярэдняй школы № 127 Фрунзенскага раёна Мінска.

РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ
МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ

Председателю ЦК Белорусского профсоюза работников образования и науки Чеботовой Т.И.

Уважаемая Тамара Иосифовна!

Прошу Вас на ближайшем заседании Президиума ЦК Белорусского профсоюза работников образования и науки повторно обсудить вопрос об участии профсоюза в акции Совета Федерации Профсоюзов Белоруссии 14 февраля с.г. в Минске.

Отмечу, что Министерство образования разделяет обеспокоенность работников системы образования и отраслевого профсоюза по вопросам уровня заработной платы в отрасли и ее материально-технического обеспечения. Министерство образования предпринимало и будет предпринимать конкретные действия по решению этих насущных для развития отрасли проблем.

Обращение к Вам обусловлено следующими причинами.

Во-первых, правительство во исполнение указаний Главы государства приняло в декабре 2000 г. меры по повышению оплаты труда работников сферы образования. В результате, в декабре, средняя заработная плата учителей составила 82,3 тыс., или 80,8 процентов от средней заработной платы в промышленности, средняя заработная плата профессорско-преподавательского состава — 144,9 тыс. руб., или 142,3 процентов от средней заработной платы промышленности.

Во-вторых, в ближайшее время Совет Министров Республики Беларусь примет решение, направленное на дальнейшее совершенствование оплаты труда работников бюджетной сферы, при этом особое внимание будет уделено повышению оплаты труда молодых специалистов.

В-третьих, во исполнение указаний Главы государства в течение 2001 года будет осуществлено поэтапное повышение заработной платы работников бюджетной сферы с целью ее доведения до уровня, соответствующего 100 долларам США.

И, наконец, в этом году планируется проведение второго съезда учителей республики, на котором будут рассмотрены и вопросы, связанные с повышением жизненного уровня работников системы образования. Министерство образования будет координировать с ЦК Белорусского профсоюза работников образования и науки разработку предложений по совершенствованию оплаты труда, материально-техническому обеспечению системы образования, более полно отражающих специфику отрасли.

Система образования в целом, учительство в особенности играют исключительно важную роль в социально-экономическом развитии нашего государства. Поэтому от обдуманной и взвешенной позиции профсоюза зависит устойчивость этого развития, стабильность и спокойствие в обществе.

Прошу Вас еще раз обсудить позицию ЦК профсоюза по вопросу участия в акции 14 февраля.

Министр В.И.СТРАЖЕВ.

Центральный комитет Белорусского профсоюза работников образования и науки ПРЕЗИДИУМ

О письме министра образования Стражева В.И., адресованном президиуму ЦК профсоюза (№ 01-04/12 от 22.01.2001 г.)

30 января 2001 г.

Рассмотрев письмо министра образования Стражева В.И. о предпринимаемых Министерством образования конкретных действиях по разрешению насущных проблем работников отрасли и необходимости координации совместных усилий в преддверии II съезда учителей Беларуси,

ПОСТАНОВЛЯЕТ:

1. Обращение министра образования Стражева В.И. принять к сведению.
2. Признавая право каждого члена профсоюза на добровольное участие в проводимых акциях и следуя принципам профсоюзной солидарности, принять участие в митинге ФПБ 14 февраля с.г. лишь силами профсоюзного актива.
3. Предложить министру образования Стражеву В.И. до 20 июня 2001 г. проинформировать президиум ЦК профсоюзов о мерах, принимаемых правительством Республики Беларусь по повышению уровня оплаты труда и гарантиях своевременной и полной выплаты отпускных работникам отрасли.
4. Принять предложение министра образования Стражева В.И. о публикации в "Настаўніцкай газеце" письма и постановления президиума ЦК профсоюза.

Председатель Т.И.ЧЕБОТОВА.

Ігар КАТЛЯРОЎ:

"Праблемы адукацыі трэба вырашаць на заканадаўчым узроўні"

Інтэрв'ю старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігара Васільевіча Катлярова.

— Ігар Васільевіч, Вы даволі вядомы ў краіне палітык, аднак не ўсе настаўнікі займаюцца палітыкай і ведаюць Вас. Таму раскажыце чытачам "Настаўніцкай газеты" больш падрабязна пра сябе. Яны хочуць ведаць, што сабой уяўляе як чалавек, як вучоны старшыня "іх" камісіі.

— Нарадзіўся ў г.п. Відзы, што на Браслаўшчыне. Мае бацькі былі сельскімі настаўнікамі. Маці на пачатку трыццатых гадоў, скончыўшы сем класаў, пачала вучыць сялян азам пісьменнасці. Хадзіла вечарамі ў аддаленыя вёскі, вучыла сялян чытаць і пісаць, змагалася з непісьменнасцю. Я і цяпер гляджу на фатаграфію маленькай кволай дзяўчынкі і думаю, што я нічога падобнага не змог бы зрабіць.

Але і тады, і цяпер, як правіла, настаўнікі — гэта асаблівыя людзі. І маці, і бацька прайшлі ўсю Вялікую Айчынную вайну, ваявалі ў партызанскіх атрадах на Шуміліншчыне, узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Пасля вайны бацькі пераехалі ў Заходнюю Беларусь, у Відзы, дзе я і нарадзіўся. З 1954 года мы ўжо жылі у г.п. Яновічы Віцебскага раёна. Бацька працаваў дырэктарам школы, маці — настаўніцай рускай мовы і літаратуры. Я з захапленнем і смуткам успамінаю той час. Паездкі з мастацкай самадзейнасцю па ўсіх навакольных вёсках, школьныя вечары, конкурсы, КВЗ, вечары з кнігай ля цёплай печы. Мы выпісвалі дамоў каля дзесятка газет, шэсць часопісаў. Маці, простая сельская настаўніца, на памяць чытала Шэкспіра, у класе, дзе яна была класным кіраўніком, заўсёды былі і духавы, і эстрадны ансамблі. Нездарма ёй было прысвоена высокае званне "Заслужаны настаўнік Беларускай ССР".

Я скончыў школу з залатым медалём і паступіў у Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці. У ВНУ захапіўся заводскай сацыялогіяй, гэта ў многім у вызначыла будучы жыццёвы шлях. Працаваў інжынерам, у партыйных органах, чытаў лекцыі ў ВНУ. Скончыў Мінскую вышэйшую партыйную школу, аспірантуру Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук БССР, абараніў кандыдацкую дысертацыю, а ў 1990 годзе абараніў дысертацыю на званне доктара сацыялагічных навук. Дарэчы, гэтая дысертацыя Расійскім ВАКам у 1992 годзе прызнана адной з лепшых у Савецкім Саюзе ў перыяд 1990 — 1991 галоў. Атрымаў званне прафесара.

У 1995 годзе з пасады дырэктара Беларускага інстытута інфармацыі і прагнозу абраны дэпутатам Вярхоўнага Савета 13 склікання, дзе працаваў старшынёй вельмі складанай і цяжкай Камісіі па правах чалавека, сродках масавай інфармацыі, нацыянальных адносінах, сувязях з грамадскімі аб'яднаннямі і рэлігійнымі арганізацыямі. Дарэчы, пераважную большасць законаў мы распрацоўвалі ў сябе ў камісіі, у тым ліку Законы "Аб зваротах грамадзян" і "Аб упаўнаважаным па правах чалавека". У мінулым годзе зноў абраны дэпутатам беларускага парламента, а потым і старшынёй Камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу. У камісіі, акрамя агульнага кіраўніцтва, вяду пытанні навукі і вышэйшай школы.

— Пра Вас у былой акрузе ходзяць проста легенды. Праўда, што Вы былі ў кожнай вёсцы акругі, ведаеце кожнага выбаршчыка ў твар?

— Я чалавек, які не прывык сядзець у кабінеце. Падчас прафесійных заняткаў сацыялогіяй праехаў і прайшоў усю Беларусь, каб самому адчуць усю гаму сацыяльна-палітычных інтарэсаў жыхароў нашай краіны. Таксама каб больш эфектыўна прадстаўляць інтарэсы сваіх выбаршчыкаў у вышэйшым заканадаўчым і прадстаўнічым органе краіны, пастараўся пабываць ва ўсіх вёсках акругі, даведацца аб праблемах людзей. Упэўнены, што дэпутат павінен не саромецца глядзець у вочы сваім выбаршчыкам. Каб ведаць патрэбнасці настаўнікаў, артыстаў, пісьменнікаў, бібліятэкараў, мы будзем пастаянна праводзіць выязныя пасяджэнні камісіі ў працоўных калектывах, сельскіх раёнах і гарадах. І адно з такіх пасяджэнняў, прысвечанае абмеркаванню праекта Закона "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь", будзе праведзена ў Пухавіцкім раёне. І мы будзем пастаянна раіцца з людзьмі, сумесна шукаць шляхі выйсця са складаных сітуацый.

— А якія праблемы ў сферы адукацыі Вас як старшыню парламенцкай камісіі больш за ўсё хвалююць?

— Адной з важнейшых нашых задач у наш час з'яўляецца заканадаўчае забеспячэнне рэформы школы. Гэта павінен зрабіць новы Закон "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь". На жаль, гэты законапраект не вырашае многіх праблем, якія сёння стаяць перад школай.

І перш за ўсё — забеспячэнне настаўнікаў нармальнай зарплатай. Сёння многія гарадскія настаўнікі вымушаны працаваць на некалькіх работах, на сяле — трымаць гаспадарку, некалькі кароў, свіней, каб пракарміць сям'ю. Гэта істотна зніжае якасць іх работы, не дае магчымасці эфектыўна працаваць над сабой, чытаць літаратуру, аднаўляць свае сілы. Неабходна, па крайняй меры, ураўняць памер сярэдняй заработнай платы работнікаў бюджэтнай сферы з сярэдняй зарплатай у прамысловасці. Для гэтага я маю намер унесці змены ў гэты Закон, які прадугледжвае выдзяленне бюджэтных сродкаў, накіроўваемых на адукацыю, у памеры 10 працэнтаў ад сукупнага валавага прадукта, так, як гэта зроблена ў Законе Расійскай Федэрацыі.

Мяне як палітыка, дэпутата, вучонага хвалюе забеспячэнне школ падручнікамі, праграмамі, вучэбнымі дапаможнікамі, інвентаром, будаўніцтва і рамонт школьных будынкаў і іншых памяшканняў. Ні для каго не сакрэт, што некаторыя падручнікі нецікавыя, малапрафесійныя, вучэбныя праграмы перагружаны. Зусім незразумела, на каго яны разлічаны. Сёння каля 40 працэнтаў дзяцей ідуць у школу хворымі, а ў школах яўна не хапае мячоў, лыжаў, спартыўнай формы. Важнейшая задача як нашай камісіі, так і ўсёй дзяржавы - павышэнне прэстыжу нашых настаўнікаў. Раней не толькі на сяле, але і ў горадзе самымі паважанымі людзьмі былі настаўнік і доктар. Сёння гэтага няма. Экраны тэлевізараў і кінатэатраў запаланілі рэкеціры і прастытуткі, а для настаўніка не знайшлося месца. У сярэдзіне 80-х гадоў быў прэстыж, была зарплата, і ў педагагічныя ВНУ, а не ў "наргас" ці "палітэх" ішлі лепшыя выпускнікі школ, і цяпер гэта вельмі добрыя настаўнікі.

— Цяпер вельмі абвастрыліся праблемы сельскай школы...

— Што да сельскай школы, то ёй трэба ўдзяліць асаблівую ўвагу. Трэба заканадаўча дапамагчы сельскім настаўнікам у атрыманні ці будаўніцтве жылля, выдзяленні льготных крэдытаў. Сельскі настаўнік зноў павінен стаць інтэлігентам, інтэлектуалам, вакол яго будзе групавацца сельская інтэлігенцыя. Але абавязак дзяржавы — даць яму рэальную магчымасць зноў стаць інтэлектуалам, мець кнігі, газеты, вольны час, павагу. На жаль, вельмі часта бывае наадварот: білет у калгасную лазню каштуе для настаўніка ў два разы даражэй, чым для пенсіянера, у чатыры — чым для калгасніка. А потым гэты ж старшыня скардзіцца, што яго дзецям даводзіцца запрашаць рэпетытара з горада.

Неабходна заканадаўча вырашыць праблемы сельскіх сацыяльна-культурных комплексаў на аснове патрэб школы, удасканалення ўсёй сістэмы выхавання. Настаўнік не павінен быць толькі прадметнікам, ён павінен быць і выхавацелем. І сёння, калі ў вёсках закрываюцца клубы, не можа быць інакш. Трэба, каб школьная спартзала была адкрыта да позняга вечара, каб у школе кожны жыхар вёскі мог узяць добрую кнігу ці паглядзець відэафільм. Але для гэтага спатрэбіцца ўзгодненая работа розных ведамстваў, павінны быць унесены змены і ў многія законы. Я, напрыклад, ужо ўнёс прапановы па змяненні ў Закон "Аб падатку з фізічных асоб". Упэўнены, што падатак з сукупнага даходу прыніжае і настаўніка, і бібліятэкара, і работніка музея, таму яго для гэтай катэгорыі працаўнікоў патрэбна адмяніць. Аднак, на жаль, не ўсе падтрымліваюць гэтае новаўвядзенне, і за яго вясной давядзецца змагацца.

Вельмі важна заканадаўча замацаваць першачарговасць вырашэння актуальных праблем агульнаадукацыйнага комплексу. Возьмем такі прыклад. У мяне ў акрузе ёсць некалькі школ, дзе газавая магістраль праходзіць літаральна па школьным двары, а ў школьнай кацельні спальваецца ламачча, якое дзеці цягаюць з балота.

Ёсць і іншыя праблемы, якія неабходна вырашаць перш за ўсё на заканадаўчым узроўні, таму што выканаўчая ўлада дзейнічае толькі ў тым прававым калідоры, які ёй вызначае закон.

Гутарыў
Арсен САКУН.

З вопыту выкладання літаратуры

Без разліку на знешні эфект

Адносіны вучняў да любога прадмета ў многім залежаць ад асобы настаўніка, ад яго педагагічнага майстэрства. Якім павінен быць настаўнік? Якімі павінны быць яго ўрокі, каб дзеці ішлі на іх з радасцю?

Яшчэ ў школьныя гады настаўніца рускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 1 Стаўбцоў Л.А.Мілкоўская пераканалася, што сярод школьных прадметаў мова і літаратура, асабліва літаратура, — важнейшыя, бо яны неабходныя кожнаму без выключэння вучню.

Па крупінках збірала настаўніца найлепшыя дасягненні перадавой педагагічнай навукі і практыкі. Але гэтыя ідэі, знаходкі яна заўсёды імкнулася выкарыстаць творча, з улікам спецыфікі прадмета, індывідуальных асаблівасцей сваіх выхаванцаў. За шматгадовы перыяд педагагічнай дзейнасці Людміла Людвігаўна стварыла сваю сістэму работы па вывучэнні рускай мовы і літаратуры.

Работу на ўроках мовы настаўніца будуе з улікам узроставых і псіхолага-педагагічных асаблівасцей вучняў на аснове асобасна арыентаванага падыходу ў навучанні. На працягу некалькіх гадоў яна вядзе паглыблены курс рускай мовы і літаратуры, ёю распрацавана сістэма падрыхтоўкі найбольш адораных дзяцей да ўдзелу ў алімпіядах. Сярод вучняў Людмілы Людвігаўны ёсць пераможцы раённых, абласных алімпіяд. Выпускніца 1998 года Наталля Цвік была ўдзельніцай рэспубліканскай алімпіяды па рускай мове.

Адной з важнейшых умоў паспяховага засваення ведаў школьнікамі настаўніца лічыць стварэнне такой атмасферы і абстаноўкі ў класе, калі выхаванцы адчуваюць сябе паспадарамі. Менавіта таму поруч са стандартнымі ўрокамі педагог выкарыстоўвае нетрадыцыйныя формы як сродак удасканалення вучэбных уменняў школьнікаў. Асаблівай увагі заслугоўваюць аўтарскія ўрокі Л.Л.Мілкоўскай — урокі-бенефісы. Такі ўрок будуецца на аснове самастойнай падрыхтоўкі двух вучняў па адной і той жа тэме з выкарыстаннем падручніка і далатковай літаратуры. Выступленне іх у класе адбываецца ў форме спаборніцтва. Клас слухае, задае пытанні, ацэньвае іх працу, выказваецца аб якасці падрыхтаванасці і дасведчанасці тых, хто адказвае, затым стандартна вывучае і замацоўвае тэму.

У сваёй практыцы настаўніца актыўна выкарыстоўвае элементы многіх сучасных тэхналогій, такіх, як:

1. *Тэхналогія поўнага засвавання ведаў.* Праз тэсціраванне, выяўленне прабелаў у ведах і іх карэкцыю, выкарыстоўваючы індывідуальныя і групавыя формы работы, настаўніца дабіваецца высокіх вынікаў працы, што пацвярджаецца трывалымі ведамі вучняў, іх уменнем граматна пісаць і гаварыць.

2. *Тэхналогія развіццёвага навучання.* Элементы тэхналогіі развіццёвага навучання настаўніца выкарыстоўвае амаль на кожным уроку, што садзейнічае развіццю творчага патэнцыялу вучняў, актывізацыі іх пазнавальнай дзейнасці. Вучні Людмілы Людвігаўны ўмеюць на высокім узроўні весці дыялог, працаваць самастойна, карыстацца даведачнай літаратурай.

Настаўніцай асвоены і паспяхова апрабуюцца на ўроках элементы тэхналогіі паэтапнага фарміравання разумовай дзейнасці вучняў(па Гальперыну) і кантактнага навучання.

Шмат гадоў аддала Людміла Людвігаўна рабоце над удасканаленнем сістэмы выкладання літаратуры. І сёння гэта сістэма ўяўляе сабой, як гаворыць настаўніца, "адзінае цэлае, якое аб'ядноўвае намаганні вучня і настаўніка, накіраваныя не ў розныя бакі, а да адной мэты".

Урокі літаратуры ў 5-6 класах — гэта пераважна ўрокі чытання і аналітычных гутарак. Пачынаючы з 7-8 класаў, настаўніца ўскладняе і разнастаіць формы работы, аддаючы перавагу самастойнай працы ў 8-9 класах, а ў 11-м практыкуе поўную самастойную працу вучняў, сама ж выступае пераважна ў ролі кансультанта.

Творчую лабараторыю педагога складаюць матэрыялы, сабраныя на працягу не аднаго дзесятка гадоў: картатэка асабістай бібліятэкі, картатэка цытат па тэмах для лекцыйных заняткаў, бібліяграфія па тэмах, матэрыялы па пісьменнікаў, настаўнікаў-наватараў, тэматычныя папкі па мове і літаратуры, сшыткі па самаадукацыі, распрацоўкі ўрокаў і пазаўрочных мерапрыемстваў, творчыя работы вучняў.

Выкарыстоўваючы іх, Людміла Людвігаўна стварае непаўторны ўрок. "Амаль не карыстаюся метадычнымі распрацоўкамі, чужы вопыт часцей за ўсё прымяняю на ўзроўні ідэй. Падабаецца, калі ёсць выбар, ёсць тое, што люблю сама, тое, што яшчэ нікім не распрацавана... Адмаўляюся ад любых рамак, канонаў, метадычных путаў, прапаведую свабодную творчасць, люблю ўдалы экспромт, хаця строга прытрымліваюся метадычных установак таго ўрока, над якім працую", — прызнаецца Людміла Людвігаўна.

У працэсе выкладання літаратуры ў старэйшых класах настаўніца выкарыстоўвае традыцыйныя і нетрадыцыйныя тыпы ўрокаў, не аддаючы перавагі ні тым, ні другім.

Цікава, жыва праходзяць урокі-лекцыі, урокі-семінары, урокі-дыспуты, урокі-даследаванні, урокі-суды, інтэграваныя ўрокі і інш.

Але ў гэтым артыкуле хочацца расказаць пра аўтарскія ўрокі Людмілы Людвігаўны — урокі адкрытых думак, распрацаваныя настаўніцай для вызначэння цікавасці вучняў да асобы і творчасці таго ці іншага пісьменніка. Такі ўрок прывяблівы тым, што вучні маюць магчымасць, не баючыся атрымаць дрэнную адзнаку (на гэтым уроку яна не ставіцца або ставіцца па жаданні), выказаць уласныя думкі і меркаванні пра твор і яго аўтара, пра творчасць у цэлым, выявіць сваю начытанасць і эрудыцыю па той праблеме, якая абмяркоўваецца. Кіруючыся вядомым правілам: "Каб атрымаць добры адказ, патрэбна паставіць добрае пытанне", Людміла Людвігаўна прапануе вучням арыгінальныя пытанні. Напрыклад, да ўрока па творчасці А.П.Чэхава "Хорошо вспомнить о таком человеке", прапануюцца і такія:

1.Если бы вам посчастливилось взять интервью у А.П.Чехова, какие бы вопросы вы ему задали, от ответа на которые он, по-вашему, не ушел бы?

2. Выработалось ли у вас убеждение, что Чехов "гений такта" и простоты?

3. О Пушкине сказано: "Веселое имя Пушкин!" Какое имя для вас Чехов?

4. Какие нравственные уроки вы взяли у Чехова?

5. Из каких рассказов писателя вы составили бы сборник и какую аннотацию к нему написали бы?

6. Какие мысли писателя, строки из его произведений вы выписали бы для себя?

7. Вернетесь ли вы когда-нибудь к прочтению Чехова? В каком возрасте?

Заслугоўваюць увагі і распрацаваныя настаўніцай урокі міжпрадметных сувязей. Адзін з іх — па раману А.С.Пушкіна "Яўген Анегін". Пасля невялікага ўступнага слова і вызначэння задач урока настаўніца ўмела канцэнтруе ўвагу вучняў на эпіграфе да ўрока:

И было сердцу
ничего не надо,
Когда пила я этот
жгучий зной,
"Онегина" воздушная
громада,
Как облако,
стояло надо мной.

А.Ахматова.

Пасля гэтага просіць вучняў выказаць свае адносіны да рамана (вучні зачытваюць сачыненні-мініяцюры "Як я чытаў (чытала) раман "Яўген Анегін", фіксуючы тыя пытанні, якія ўзніклі ў ходзе чытання твора). Далей ідзе работа па тэме. Вучням прапануецца адказаць на пытанні, звязаныя з гісторыяй стварэння рамана "Яўген Анегін". Настаўніца ўмела падводзіць вучняў да характарыстыкі эпохі, у якую ствараўся раман, да ўплыву яе на чалавека, выкарыстоўваючы міжпрадметныя сувязі:

— А які гэта быў час? Ці можна сцвярджаць, што эпоха, час уздзейнічаюць, уплываюць на чалавека, фарміруюць яго ўнутраны свет? Падумайце. Вам гэта вядома з урокаў "Чалавек. Мараль. Права".

Затым засяроджваецца ўвага вучняў на задачы другой часткі ўрока — паглыбіцца ў эпоху 10 — 20 гадоў, каб зразумець сутнасць характару галоўнага героя рамана.

Педагог звяртае ўвагу і на тыя праблемныя пытанні, якія прагучаць у ходзе гутаркі. У работу ўключаюцца вучні-гісторыкі (расказваюць аб праўленні цароў Аляксандра I і Мікалая I), вучні-мастацтвазнаўцы ("Тэатр пачатку XIX ст.", "Музыка пачатку XIX ст."). Каб актывізаваць пазнавальную дзейнасць вучняў, прыцягнуць іх увагу да эпохі Пушкіна, вучням прапануецца паглядзець відэазапіс фрагмента "Гасцёўня Пушкінскай пары" (пасля прагляду вучні запісваюць у сшыткі пачутыя імёны і прозвішчы).

Затым настаўніца прапануе адказаць на пытанні:

— Ці паказаў Пушкін гэту эпоху ў сваім рамане?

— Якімі ж былі адносіны маладых людзей і самога Пушкіна да самадзяржаўя?

— Ці мог Пушкін не паказаць уласнае жыццё ў рамане? Калі так, то як?

У работу ўключаюцца вучні-літаратуразнаўцы (аналітыкі, чытальнікі), гучаць радкі з вершаў А.С.Пушкіна "К Чаадаеву", "Деревня", оды "Вольность", разважанні пра трагізм лёсу рускіх пісьменнікаў таго часу, пра расчараванні і апатыю ў асяродзі "залатой моладзі", прыводзяцца прыклады з твораў рускай і сусветнай літаратуры.

У працэсе ўрока працуюць усе: і настаўнік, і вучні. Шмат увагі на ўроку ўдзяляецца самастойнай працы, на працягу ўсяго ўрока вучні робяць запісы ў сшытках.

Вялікую работу на ўроках літаратуры Людміла Людвігаўна праводзіць па развіцці мовы. Навучанне сур'ёзнаму сачыненню, якое адпавядала б усім метадычным патрабаванням, яна пачынае ў 9 класе, а ў 10-м ужо ідзе ўдасканаленне навыкаў, асваенне новых жанраў і відаў творчых прац. У 11 класе настаўніца практыкуе вопыт Я.М.Ільіна па правядзенні творчых семінараў.

Падбор тэм сачыненняў Людміла Людвігаўна робіць у разліку на іх незвычайнасць, на зацікаўленасць вучняў, стараецца разнастаіць іх. Напрыклад:

1. Дапісванне твораў: "Монолог Кабанихи после гибели Катерины", "Предисловие к роману "Обломов".

2. Сачыненне ў выглядзе ліста герою ці аўтару: "Письмо Наташе Ростовой", "Спасибо вам, Федор Михайлович", "Я знаю — вам труднее всех" (письмо матери Раскольникова).

3. Сачыненне-разважанне: "Что такое характер" (по драме "Гроза"), "Вопрос "Что делать?" в моей жизни", "Человек, с которым я хотел бы идти по жизни" (в связи с изучением романа "Преступление и наказание").

Часта настаўніца прапануе вучням тэмы з напаўжаргоннай назвай, але з сур'ёзным падтэкстам: "Как хорошо, что четыре тома" (для тых, каму падабаецца "Вайна і мір"), "Ну зачем четыре тома?" (для тых, каму раман не падабаецца).

Трывала ўвайшлі ў практыку работы настаўніцы сачыненні-мініяцюры, мэта якіх — вывучыць стаўленне вучняў да таго ці іншага твора ("Как я читал комедию "Горе от ума" или роман "Евгений Онегин", или "Герой нашего времени").

Вялікую ролю ў развіцці пазнавальных і творчых здольнасцей вучняў мае пазакласная праца. Праводзіцца яна Людмілай Людвігаўнай, настаўнікам-эрудытам, настаўнікам-энтузіястам, не фармальна, а творча, без разліку на знешні эфект. Для вучняў 6-7 класаў працуе клуб аматараў кнігі, 9 класаў — інтэлектуальны клуб "А + Б + В". Цікава праходзяць мерапрыемствы ў літаратурна-музычнай гасцёўні, заняткі ў гуртку юных паэтаў "Дар душі и дар глагола". У сярэдняй школе № 1 Стаўбцоў пад кіраўніцтвам Л.Л.Мілкоўскай і яе калег-моваведаў рэгулярна праводзяцца мерапрыемствы, прысвечаныя юбілеям пісьменнікаў і паэтаў.

Урокі Людмілы Людвігаўны Мілкоўскай заўсёды пакідаюць добры след у сэрцах яе вучняў, іх бацькоў, калег. На заняткі дзеці ідуць з радасцю, а багатая разнастайнасць вучэбных заняткаў, пошук эфектыўных метадаў і форм іх правядзення садзейнічае авалоданню школьнікамі глыбокімі і трывалымі ведамі.

Ванда ДЗЯМЯНКА,
метадыст
вучэбна-метадычнага кабінета
Стаўбцоўскага раённага
аддзела адукацыі
Мінскай вобласці.

НА ЗДЫМКУ: Л.А.Мілкоўская з сынам.

Физический факультет

Белорусского государственного университета
ждет Вас

Физический факультет Белгосуниверситета приглашает принять участие в олимпиаде **"Абитуриент БГУ – 2001"**, которая проводится с целью конкурсного отбора талантливой молодежи, желающей связать свою судьбу с одним из старейших факультетов ведущего вуза Республики.

Физический факультет в рамках специальности "Н.02.01.00-физика" готовит высококвалифицированных специалистов для различных отраслей народного хозяйства, научных и учебных заведений по 24 специализациям. Обучение на факультете осуществляется по трем направлениям – производственному, педагогическому и инженерно-физическому. В зависимости от выбранного направления выпускники физического факультета получают квалификацию "Физик. Исследователь", "Физик. Преподаватель физики и информатики" или "Физик. Инженер". С 2000 г. на факультете открыта **подготовка специалистов с квалификацией "Физик. Менеджер".** Кроме этого, студенты, обучающиеся в специализированных группах и слушающие лекции на английском языке, имеют возможность получить удостоверение референта-переводчика технической литературы.

Олимпиада **"Абитуриент БГУ – 2001"** по физике проводится в три тура – заочный и два очных. К участию в заочном туре приглашаются ученики выпускных классов средних общеобразовательных заведений, учащиеся выпускных курсов средних специальных заведений или ПТУ, а также лица, имеющие среднее образование. Участники, успешно справившиеся с заданиями заочного тура, будут приглашены в Минск на **первый очный тур**, который состоится в **середине апреля 2001 года** в Белгосуниверситете.

Без предварительного отбора к первому очному туру допускаются ученики выпускных классов лицея БГУ.

К заключительному туру олимпиады допускаются победители второго тура.

На заключительный очный тур без предварительного отбора будут персонально приглашены участники республиканских олимпиад по физике и астрономии, победители областных и Минской городской олимпиад, победители республиканского турнира юных физиков и республиканской научной конференции школьников по физике.

Ученикам выпускных классов сельских школ при подведении результатов олимпиады могут начисляться дополнительные баллы, количество которых определяется приемной комиссией.

Заключительный (очный) **тур** олимпиады **"Абитуриент БГУ – 2001"** по физике состоится **13 мая 2001 года в Белгосуниверситете.**

Победители олимпиады "Абитуриент БГУ – 2001" по физике без вступительных экзаменов зачисляются на первый курс физического факультета. Призеры олимпиады получают право поступать на физический факультет на условиях, предусмотренных "Правилами приема в БГУ на 2001 год" для лиц, которые окончили среднюю школу с золотой (серебряной) медалью.

Льготами при зачислении победители и призеры олимпиады "Абитуриент БГУ – 2001" пользуются **только в год ее проведения**.

Решение задач первого тура необходимо записать в тетрадь. На обложке указать фамилию, имя, отчество; почтовый индекс, полный домашний адрес, школу, класс; фамилию, имя, отчество учителя физики. Тем, кто окончил школу – год окончания и род занятия.

Тетрадь следует отправить по адресу: 220050, г. Минск, проспект Ф. Скорины, 4. Белгосуниверситет, физический факультет. Олимпиада "Абитуриент БГУ – 2001".

Участие в первом туре олимпиады **платное**. Стоимость участия — 3100 рублей. Деньги отправляются почтовым переводом или банковским переводом с пометкой "Олимпиада" по адресу: 220050, г. Минск, пр-т Ф. Скорины, 4, Белгосуниверситет, расчетный счет 3622204930033 в Минской городской дирекции ОАО "Белбизнесбанк", код 764. Желающие могут осуществить оплату непосредственно в расчетно-кассовом центре Белгосуниверситета (ул. Октябрьская, 10, тел. 229-25-90). Квитанция об оплате высылается или сдается вместе с работой первого тура.

Последний срок отправки – 1 марта 2001 года.

Задачи заочного тура олимпиады по физике "Абитуриент БГУ – 2001"

1. Шарик, подвешенный на нити, качается в вертикальной плоскости так, что его ускорения в нижнем и крайнем положениях равны по модулю. Найти угол отклонения нити от вертикали в крайнем положении.

2. В теплоизолированный цилиндрический сосуд поместили кусок льда при нулевой температуре и прочно прикрепили его ко дну. Затем залили лёд таким же по массе количеством воды. Вода полностью покрыла лёд и достигла уровня $H = 20$ см. Определить, какова была температура этой воды, если после установления теплового равновесия, её уровень опустился на $b = 0{,}40$ см. Плотность льда $c = 920$ кг/м^3, удельная теплоёмкость воды $c = 4200$ Дж/кг К, удельная теплоёмкость льда в два раза меньше. Удельная теплота плавления льда $\lambda = 330$ кДж/кг.

3. Две параллельные сетки подключены к батарее $\varepsilon = 10$ В. Под углом 45^0 на сетки падает параллельный пучок электронов с начальной энергией E = 10 эВ. На какой угол α отклонится от первоначального направления пучок, пройдя сетки?

4. На главной оптической оси собирающей линзы на расстоянии 60 см от нее находится точечный источник света. Линзу передвинули, в направлении перпендикулярном к главной оптической оси, на расстояние 1,0 см. На какое расстояние и в какую сторону нужно переместить источник, чтобы его изображение оказалось на прежнем месте. Главное фокусное расстояние линзы 20 см.

5. Сколько избыточных электронов накапливается на единице площади поверхности металлической ленты, равномерно движущейся со скоростью 1,0 *м/с* в однородном магнитном поле с индукцией $B = 0{,}10$ Тл так, что скорость перпендикулярна вектору $\vec{B}$ и лежит в плоскости ленты.

Желаю успеха и надеюсь увидеть Вас среди студентов физического факультета.

В.М. АНИЩИК,
декан физического
факультета, профессор.

Рупліўцы педагогікі

Самая лепшая ўзнагарода

Ніна Уладзіміраўна Хмялеўская — вядомы педагог на Любаншчыне. Яна вызначаецца вялікім працалюбствам, любоўю да дзяцей, пастаянным пошукам эфектыўных форм навучання і выхавання вучняў. На ўроках выкарыстоўвае ўсё новае, перадавое.

Ніна Уладзіміраўна — эрудзіраваны спецыяліст. Як мовавед Хмялеўская асаблівую ўвагу ўдзяляе навучанню арфаграфіі. Яна лічыць, што нельга дапускаць паслаблення ў рабоце па арфаграфіі, паколькі арфаграфічная граматнасць з'яўляецца адным з паказчыкаў моўнай і агульнай культуры чалавека.

Настаўніца распрацавала сістэму індывідуальнай работы па картках, што дапамагае дабівацца выдатных вынікаў. Яе выхаванцы з году ў год займаюць прызавыя месцы на раённых і абласных алімпіядах. Ужо з пятага класа Н.Хмяльніцкая праводзіць урокі рыторыкі, выразнага чытання, славеснасці, каб навучыць дзяцей успрыманню мастацкага твора ў адзінстве зместу і формы, бачыць і разумець не толькі ШТО сказаў нам майстар слова, але і ЯК яму гэта ўдалося.

Вялікую ўвагу выкладчыца рускай мовы і літаратуры ўдзяляе ўрокам літаратуры, на якіх вучыць падлеткаў асэнсоўваць агульначалавечыя каштоўнасці, якія выпрацаваны ўсімі папярэднімі пакаленнямі. Арганічным працягам урокаў літаратуры сталі паэтычныя пятніцы. Вялікае жаданне педагога выйсці за межы ўрока, даць дзецям больш магчымасцей пазнаёміцца, дакрануцца да багацця сусветнай мастацкай літаратуры, навучыць думаць, суперажываць прывялі Ніну Уладзіміраўну да неабходнасці стварэння клуба "Натхненне". І вось ужо дванаццаць гадоў у літаратурнай гасцёўні Сорацкай сярэдняй школы ў саюзе з музыкай, малюнкам, танцам, мастацкім чытаннем вучні даведваюцца шмат новага і цікавага аб жыцці і творчасці многіх рускіх, беларускіх і замежных пісьменнікаў і паэтаў.

Як адзначыў намеснік загадчыка Любанскага раённага аддзела адукацыі Валерый Уладзіміравіч Фурык, Ніна Уладзіміраўна знаходзіцца ў пастаянным творчым пошуку, дзеліцца вопытам з іншымі настаўнікамі, з'яўляецца кіраўніком метадычнага аб'яднання настаўнікаў рускай мовы і літаратуры раёна. Распрацаваныя ёю ўрокі з выкарыстаннем новых педтэхналогій змешчаны ў зборніку Мінскага абласнога ІПК "Інавацыйныя падыходы да выкладання рускай мовы і літаратуры".

Трэба падкрэсліць, што Ніну Уладзіміраўну паважаюць і любяць дзеці. Для многіх яна стала любімай настаўніцай, на якую хацелася б быць падобным. Па прыкладу настаўніцы аж дзесяць яе выпускнікоў выбралі шлях выкладчыка рускай мовы і літаратуры (чатыры з іх — выпускнікі Сораўскай сярэдняй школы). А гэта — лепшая ўзнагарода для педагога. Ніна Уладзіміраўна мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю, узнагароджана граматай абласнога ўпраўлення адукацыі, мае званне "Настаўнік-метадыст". Больш бы такіх апантаных педагогаў-падзвіжнікаў працавала ў нашых школах, дык і школьнікам жылося б весялей, і рэформа б ішла шпарчэй.

Мікалай ГРУДЗІНСКІ,
метадыст Мінскага
абласнога ІПК.

Навіны

Сумесная ВНУ

На базе Магілёўскага дзяржаўнага тэхналагічнага інстытута будзе створаны беларуска-расійскі універсітэт. Пагадненне аб гэтым падпісалі міністры адукацыі Беларусі і Расіі на сумеснай калегіі, якая прайшла ў Магілёве.

Стварэнне сумеснай ВНУ, на думку спецыялістаў, паспрыяе інтэграцыйным працэсам. Цяпер Магілёўскі інстытут, які ўжо мае добрую навукова-адукацыйную і матэрыяльна-тэхнічную базу, яшчэ атрымае і дадатковае фінансаванне.

Падручнікі на беларускай мове

У Польшчы выдадзены падручнікі на беларускай мове. Іх прэзентацыя прайшла ў Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку. Аўтарам кніг з'яўляецца настаўніца беларускай мовы і літаратуры горада Бельск-Падлескі Тамара Русачок.

Абодва падручнікі, а гэта кнігі для першакласнікаў "Са спадчынай у будучыню" і "Хрэстаматыя" для вучняў 1 — 3-х класаў гімназіі, выдадзены ў беластоцкім выдавецтве "Артдрук".

Пісьменнікі — дзецям

Гомельскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў і абласная бібліятэка пачалі творчую акцыю пад назвай "Пісьменнікі — дзецям".

Яе мэта — прапаганда беларускай мовы і літаратуры. Акцыя была распачата ў Светлагорскім раёне. Пісьменнікі сустрэліся з мясцовымі чытачамі — настаўнікамі, школьнікамі.

Далейшы маршрут творчай акцыі — у іншыя раёны Гомельшчыны.

Казімір ЮРОЙЦЬ.

Педагагічная майстэрня

Хімічная "рызыка-версія"

Гэтая інтэлектуальная гульня з "хімічным" зместам праводзіцца па тых жа правілах, што і аналагічная тэлевізійная гульня на БТ. У ёй прымаюць удзел чатыры каманды па 6 чалавек. Калі гульню праводзім як пазакласнае мерапрыемства, то каманды падбіраюцца з вучняў паралельных класаў, а калі гэта нестандартны ўрок па хіміі, то з вучняў аднаго і таго ж класа.

Адначасова ў гульні прымаюць удзел дзве каманды. Права першага ходу разыгрываецца па жэрабю. Каманда мае права "рызыкаваць", г.зн. адказваць без падрыхтоўкі і атрымаць 2 балы за правільны адказ, ці "гуляць", г.зн. атрымаць 1 бал за правільны адказ пасля абмеркавання адказу на пытанне на працягу 30 секунд. Калі каманда не дае вернага адказу, то на пытанне маюць права адказваць сапернікі і атрымаць 1 бал за правільны адказ. Затым другая каманда адказвае на чатыры пытанні, а потым абедзве каманды па чарзе адказваюць на пытанне "з капелюша". Для гэтага трэба склеіць з кардону вялікі капялюш. У ім асістэнт вядучага выносіць колбы з наклеенымі назвамі рэчываў ці прадметы, пра якія гаворыцца ў пытанні.

Каманды-пераможцы першай і другой гульні бяруць удзел у фінале. У тайм-аутах дзеці могуць прачытаць вершы, выканаць песні, паказаць інсцэніроўку вясёлай рэкламы, можна правесці эксперымент — паказаць цікавы вопыт па хіміі.

Хімічная "рызыка-версія".

Тэма: Вуглевадароды

I гульня

1. Перакладзіце на грэчаскую мову слова "падобны". (Гамолаг).

2. Формула "масляроднага газу"... (C2H4.)

3. Пра якія хлорвытворныя алканы ішла гаворка ў кнізе Верасаева "Запіскі ўрача"? (Хлараформ ці ёдаформ.)

4. Джульета казала: "Ружа пахне ружай". А як скажа хімік, чым пахне ружа? (Фенілэтылавым спіртам.)

II гульня

1. Якое рэчыва лёгка акісляе бензол? (Бензол стойкі да акіслення)

2. Як па латыні завецца клас насякомых? (Insecta, параўнайце: інсектыцыды.)

3. Дзе ўжываюцца лёгкаспальвальныя хлорвытворныя алканаў? (Хладаагенты.)

4. Сыравіна для атрымання метанолу, воцатнай кіслаты, сінтэтычных каўчукаў, сінтэз-газу. (Метан.)

Пытанні "з капелюша"

1. Рэчыва, з якога рабілі цацкі на Гаіці яшчэ ў XY стагоддзі. (Каўчук.)

2. Рэчыва, назва якога перакладаецца як "слёзы дрэва". (Каўчук.)

Тайм-аўт

III гульня

1. 1,3-дымецілбензол і мэтаксілол — гэта гамолагі ці ізамеры? (Гэта адно і тое ж рэчыва.)

2. Гамолаг бензолу з "выбухованебяспечным характарам"? (Талуол.)

3. Што ёсць (акрамя двайной сувязі) у алкенаў і дыенавых, але няма ў алкінаў? (Стэрыёізамерыя.)

4. Назавіце прозвішча прамыслоўца, які разарыўся, бо дрэнна ведаў уласцівасці каўчуку. (Макінтош.)

IV гульня

1. Як зрабіць бензол ворагам жукоў? (Атрымаць з яго інсектыцыды.)

2. Каўчук — светла-карычневы. А чаму шыны чорныя? (Напаўняльнік — сажа.)

3. Апошні тэрмін прадстаўлення экспаната на выставу — 1.01.1928 г. Экспанат дастаўлены 30.12.1928 г. і заняў першае месца. (Каўчук.)

4. Гаворыць, формулу гэтага рэчыва вучонаму падказалі малпы. (Бензол.)

Пытанні "з капелюша"

3. У капелюшы — мадэль малекулы рэчыва, якое з'яўляецца зыходным прадуктам для атрымання метанолу, сінтэтычнага бензіну, каўчуку і інш. (Метан.)

4. У капелюшы — выраб з рэчыва, якое атрымліваецца пры павышанай тэмпературы, ціску і ў прысутнасці каталізатара. (Поліэтылен.)

Тайм-аўт.

V гульня

1. "Ох і з'едлівыя ж характары ў гэтага сямейства", — гаварыў ляснічы з казкі "Папялушка". А ў якога інсектыцыду "характар" найменш ядавіты? (Карбафос.)

2. "Народная газета" паведаміла, што ў адным з калгасаў адкрылі завод па вытворчасці метану. Што з'яўляецца сыравінай? (Гной.)

3. Якую ролю адыграла "масла галандскіх хімікаў" у гісторыі алкенаў? (Гістарычная назва "алефгены" пайшла ад таго, што этылхларыд — масляністае рэчыва.)

4. "Што занадта, тое не разумна", — гаворыць палякі. Што атрымаецца, калі пры вулканізацыі каўчуку дабавіць шмат серы? (Эбаніт.)

VI гульня

1. Якое рэчыва з'явілася прычынай гібелі ў балоце гераіні аповесці "А зоры тут ціхія" Лізы Брычкінай? (Балотны газ — метан.)

2. Чаму ягады брусніцы добра захоўваюцца без цукру? (Яны змяшчаюць бензойную кіслату — добры кансервант.)

3. Чаму тэтрахлорметан ужываецца пры тушэнні пажараў? (Цяжкія пары ізалююць прадмет, які гарыць, ад доступу кіслароду.)

4. Кот Леапольд ператвараўся ў леапарда, калі ён выпіваў "азвярын". А ў што ператворыцца метан, калі ў яго адняць адзін атам вадароду? (Радыкал.)

Пытанні "з капелюша"

5. У капелюшы — шырокавядомае вынаходніцтва М.Д. Зялінскага і А. Куманта. (Процівагаз.)

6. У капелюшы — тое, што пахне дыфенілавым эфірам. (Галінка герані.)

Падвядзенне вынікаў гульні.

Галіна КАПЕЦКАЯ,
настаўніца хіміі гімназіі
Светлагорска.

Падрабязнасці для "НГ"

Пад воклічы "брава!"

У канцы кастрычніка мінулага года на сцэнічных пляцоўках сталіцы ўзяў старт Фестываль народнай творчасці "Сузор'е". На працягу двух мясяцаў ва ўсіх дзевяці раёнах сталіцы 230 калектываў і асобныя ўдзельнікі паказвалі свой талент у спевах, танцах, ігры на музычных інструментах, выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. У ім прынялі ўдзел 3700 чалавек. Сярод іх было шмат вучняў і настаўнікаў.

57 калектываў і асобныя выканаўцы ўдастоены ганаровага звання "лаўрэата" і 123 — "дыпланта".

З сярэдзіны студзеня гэтага года пачаліся агляды-конкурсы ў калектывах, якія ўдастоены ганаровага звання "народных" і "ўзорных".

Так, 20 і 21 студзеня слухачы цёпла прымалі ў Палацы культуры чыгуначнікаў выступленне ансамбляў і аркестраў народных інструментаў на свяце музыкі "Гаманіна", якія больш за дванаццаць гадзін выконвалі творы Міхаіла Агінскага, Яўгена Глебава, Нестара Сакалоўскага, Юрыя Семянякі, Ігара Лучанка, Дзмітрыя Смольскага і іншых беларускіх кампазітараў, а таксама класікаў заходнееўрапейскай музыкі.

У аўтарытэтнае журы ўваходзілі нават тры прафесары БДАМ (Акадэміі музыкі) — народны артыст Беларусі Яўген Гладкоў, заслужаны дзеяч мастацтваў Міхаіл Солапаў і Барыс Сінецкі, а таксама іншыя вядомыя дзеячы культуры і мастацтва. Яны назвалі пяць лаўрэатаў. Сярод іх два калектывы сярэдніх школ Мінска.

Узорны цымбальны аркестр "Першацвет" сярэдняй школы № 13 з Першамайскага раёна (дырыжор Віктар Тульвінскі) у другі раз удастоены гэтай пашаны. Так, ён у 1997 годзе стаў лаўрэатам. Аркестр быў заснаваны ў 1986 годзе Віктарам Сцяпанавічам, які па сённяшні дзень кіруе калектывам. У поспехі аркестра ўнеслі сваю долю салісты Таццяна (фартэпіяна) і Павел (флейта) Сурагіны, а таксама спявак Дзмітрый Шчарбакоў, які выконваў песні на італьянскай мове.

А вось узорны аркестр народных інструментаў сярэдняй школы № 66 з Савецкага раёна (кіраўнік і дырыжор Таццяна Трусава) упершыню названы лаўрэатам, хаця ён ужо адзначыў сваё 15-годдзе. А Таццяна Фёдараўна кіруе калектывам з 1991 года.

Воклічы "брава" некалькі раз гучалі ў зале, калі спявала Ванда Гарохава песню народнага артыста Рэспублікі Беларусь Леаніда Захлеўнага "Азёры дабрыні". Яна настаўніца вакала і вядзе хор хлопчыкаў у школе.

Лаўрэатамі сталі народныя аркестры народных інструментаў БДПУ імя М.Танка і БДУ, а таксама народны цымбальны ансамбль "Ведрыца".

Тры калектывы адзначаны дыпломамі I ступені. Сярод іх узорны аркестр народных інструментаў сярэдняй школы № 102 (дырыжор Тамара Жураўская).

Пятро ГРАДЗІЕНКА.

Адукацыя ў асобах

На вяршыні прафесійнага майстэрства

ВОСЬ і закончыўся працоўны дзень. Праўда, на некалькі гадзін пазней, чым звычайна. Тэрміновыя выдавецкія заданні і справы, бывае, вымагаюць гэтага. Здаўшы на вахту ключы, выходзім з калегам на вуліцу.

Зіма, нарэшце, уступіла ў свае правы. Канец студзеня, як-ніяк. І снегу падкінула, і марозец па хрышчэнскі прыцісну. Заўседы хочацца ў такія вечары глядзець на неба. Хоць і светлавата на прыступках інстытуцкай лесвіцы ад вулічных ліхтароў, але ўсе роўна бачна, як самыя-самыя яркія зоркі прыгожа мігаць у бязвоблачным студзеньскім небе.

Міжволі азіраюся на будынак свайго інстытута.

– Гляньце, Дзмітрыевіч! Вы казалі, што адны мы так позна затрымаліся. Яшчэ вунь святло гарыць у кагосьці ў вокнах, як зоркі на небе?

– А, дык гэта Ільін думае над новымі навуковымі праектамі, – сказаў з веданнем справы мой калега. Дзмітрыевіч даўно працуе ў інстытуце, дык добра ведае не толькі кожнага, але дзе і чыё акно.

Развіталіся і пайшлі кожны на свой прыпынак.

Па дарозе ўвесьчас не пакідала думка: як можна прымусіць сябе так многа працаваць у навуцы, ды яшчэ на ніве прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі. І захацелася паболей даведацца пра гэтага чалавека, пра яго жыццёвы шлях, працоўную і навуковую дзейнасць, творчыя планы. Тым больш, як аказалася, і другая прычына з'явілася: вось-вось у Ільіна Міхаіла Васільевіча юбілей.

Таму я выбраў найбольш блізкія тры адрасы і накіраваўся ў вольны час да іх носьбітаў.

Адрас першы — кадравы сайт

Ужо з самага пачатку высветлілася, адкуль у Міхаіла Васільевіча цяга да працавітасці. У першую чаргу ад бацькоў. Таму што роўна пяцьдзесят гадоў таму назад, мабыць, у такую ж марозную студзеньскую ноч, недзе на прыбярэжнай страмніне ракі Бярэзіны ў Бабруйску, у сям'і рабочых нарадзіўся маленькі Ільін. Затым – сярэдняя школа № 14, Жытомірскае вышэйшае ваеннае вучылішча, Мінскі радыетэхнічны інстытут.

Працоўную дзейнасць М. В. Ільін пачаў у 1974 годзе ў якасці майстра вытворчага навучання, спачатку ў Бабруйскім тэхнічным вучылішчы № 95 хімікаў, а затым у Мінскім ПТВ № 10. Праца майстра – складаная справа. Асабліва, калі трэба навучыць вучняў складаным, навукаёмкім прафесіям, такім як радыёмеханік па рамонту радыётэлевізійнай апаратуры і электронных прыбораў. Але Міхаіл Васільевіч спраўляўся з абавязкамі майстра сапраўды па майстэрску.

Акрамя працавітасці, з набыццём вопыту майстра выяўляюцца і арганізатарскія здольнасці. Таму з 1978 года Ільін паспяхова працуе на пасадзе намесніка дырэктара вучылішча па вучэбна-выхаваўчай рабоце. І тут ён праяўляе ініцыятыву ў дасканаленні сістэмы выхаваўчай работы ў вучылішчы, дзе дамінуючае месца займае індывідуальная работа з навучэнцамі. Мабыць, таму сёння многія з выпускнікоў ПТВ № 10 з веданнем справы творча працуюць у тым ліку і на розных кіруючых пасадах такіх вядомых прадпрыемстваў – АТ "Мінскі гадзіннікавы завод", АП "Бел-ВАР", ВА "Гарызонт" і іншых.

Ступенечка за ступенечкай вядзе Ільіна М. В. з кіруючай пасады ў навучальнай установе ў органы кіравання прафесіянальна-тэхнічнай адукацыяй. З 1987 года ён прызначаецца намеснікам начальніка упраўлення адукацыі Мінгарвыканкама.

Будучы чалавекам творчага складу, М.В.Ільін доўгі час з'яўляўся кіраўніком метадычных секцый намеснікаў дырэктараў па вучэбна-выхаваўчай рабоце і дырэктараў прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў Мінска. Пры яго непасрэдным кіраўніцтве ў сярэдніх школах сталіцы атрымаў развіццё тэхналагічны профіль дыферэнцыраванага навучання, створаны і паспяхова функцыянуюць некалькі вышэйшых прафесійных вучылішчаў (ВПВ), палітэхнічныя цэнтры ў Савецкім і Маскоўскім раёнах, Мінскі гарадскі вучэбна-прафесіянальны цэнтр дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Вопыт падобных цэнтраў распаўсюдзіўся па ўсёй рэспубліцы. Цэнтры прафесіянальнай адукацыі створаны ў Жодзіна, Магілёве і іншых.

Па ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле М.В.Ільіна ў Мінску вось ужо 10 гадоў функцыянуюць вытворчыя ўчастак для падлеткаў на базе Міжшкольных вучэбна-вытворчых камбінатаў.

Уся практычная дзейнасць М.В.Ільіна пастаянна суправаджалася навуковым абгрунтаваннем рэалізуемых адукацыйных праектаў.

Адсюль адрас другі — кафедра РІПА

На гэты раз ужо пашанцавала мне, таму што маім субяседнікам згадзіўся пабыць на некаторы час прарэктар па навуковай рабоце, загадчык кафедры эканамічных дыс-цыплін, доктар філасофіі, прафесар Мікалай Іванавіч Латыш.

– На пасадзе прарэктара па вучэбна-метадычнай рабоце Ільін працуе з 1995 года. Адразу скажу, што Міхаіл Васільевіч за год да гэтага паспяхова абараніў кандыдатскую дысертацыю на тэму "Арганізацыйна-педагагічныя ўмовы развіцця рэгіянальнай сістэмы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі". Абароне, безумоўна, папярэднічала прадуманая навукова-даследчая работа. Яшчэ будучы на пасадзе намесніка начальніка ўпраўлення адукацыі Ільін прымаў самы актыўны ўдзел у распрацоўцы Канцэпцыі развіцця прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі ў Беларусі. Затым патрэбна было падрыхтаваць Праграму развіцця прафесіянальнай адукацыі ў краіне, таму што да 1992 года мы фактычна карысталіся расійскімі праграмамі па многіх накірунках.

Магу з упэўненасцю сказаць, што М.В.Ільін прайшоў усе ступені на шляху да сапраўднага даследчыка. Таму сёння ў інстытуце, а ўвогуле і рэспубліцы, ён з'яўляецца адным з асноўных распрацоўшчыкаў цэлай сістэмы навукова-метадычнага забеспячэння прафесіянальнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Ну, а калі патрэбна агульная характарыстыка – хачу падкрэсліць самае, мне здаецца, адметнае: М.В.Ільін, і як кіраўнік і як навуковец, увесь час у пошуку. І перш чым прапанаваць нейкі новы праект, ён вельмі скрупулёзна спачатку вывучае, пераасэнсоўвае тое, што ёсць у навуцы па даследуемай праблеме, даходзіць да самых глыбінь, а потым ужо на основе свайго практычнага вопыту і аналітычнага складу думкі праектуе новыя неардынарныя структуры. І заўсёды даводзіць справу, праект да рэалізацыі.

– Дзякуй, Мікалай Іванавіч.

На гэтым мы развіталіся.

Адрас трэці — кабінет прарэктара

Папасці на прыём да прарэктара Ільіна ўдалося не адразу. І не таму, што, як часам бывае, чалавек, калі ўжо займае нейкі высокі пост, то пачынае фанабэрыцца, перастае за руку вітацца, спасылаецца на безліч спраў. У дадзеным выпадку ўсё было якраз наадварот. Тут спраўдзіліся словы У. У. Савасцені: людзі ідуць да Ільіна як да дарадчыка, настаўніка, калегі, цікавага субяседніка. Гэта я і сам зразумеў, калі ўсё ж апынуўся ў кабінеце Міхаіла Васільевіча.

Інтэрв'ю атрымалася само сабой. Замест сухіх адказаў на пытанні, што нярэдка бывае ў гутарках з навукоўцамі (ведаю з практыкі) завязалася добразычлівая размова. Прапанаваць чытачу ўвесь дыктафонны запіс, думаю, не мае патрэбы. А вось некалькі пытанняў, якія найбольш яскрава давершаць нашу характарыстыку пра героя нарыса, лічу абавязковымі:

– Міхаіл Васільевіч, над чым зараз працуеце як вучоны?

– Перш за ўсё, хачу сказаць, што вялікім вучоным я сябе пакуль што не лічу, хаця гэтае пытанне і спрэчнае. Больш чым трынаццаць гадоў я аддаў практычнай рабоце непасрэдна ў прафесіянальна-тэхнічным вучылішчы. І нават кіраўнічыя пасады ва ўпраўленні адукацыі таксама можна аднесці до практычнай прафесіянальнай педагогікі. За той час было зроблена нямала інавацый, якія апрабіраваны часам і ўваходзяць сёння ў дзяржаўныя рэспубліканскія праекты, канцэпцыі. Больш грунтоўна навукай я заняўся недзе гадоў дзесяць назад. Вось і зараз, паколькі я вырас з практыка, усе свае праекты я стараюся прызямліць, гэта значыць, каб навуковыя працы мелі толькі канкрэтную практычную накіраванасць.

Сёння, напрыклад, разам з калектывам супрацоўнікаў РІПА, абласных і Мінскага гарадскога вучэбна-метадычных цэнтраў прафесіянальнай адукацыі і педагогамі мы праводзім актыўную работу па стварэнні новага пакалення вучэбных планаў і праграм, прафесіянальна-кваліфікацыйных характарыстык і адукацыйных стандартаў. З новага навучальнага года пачнецца працэс укаранення камплектаў новай дакументацыі ў практыку.

Сёння М.В.Ільін таксама на вяршыні, толькі не прыбярэжнай страмніны, а на вяршыні прафесіянальнага педагагічнага майстэрства. Бо сёння ён – адзін з тых, хто найлепей бачыць праблемы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, ведае да драбніц усе рыфы вучэбна-выхаваўчага працэсу.

І нездарма, за сваю бескарысную працу, за выдатныя асабістыя якасці – добразычлівасць і сумленнасць, чуласць і паважлівасць, адказнасць і прафесіяналізм, М. В. Ільін мае высокі аўтарытэт сярод выкладчыкаў, калег, вучоных. Добра ведаюць яго і за мяжой, дзе Ільін таксама з гонарам прадстаўляе нашу рэспубліку ў Міжнародным клубе інстытутаў прафесіянальнай адукацыі краін Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы. У 1998 годзе абраны членам-карэспандэнтам Беларускай акадэміі адукацыі. За значны ўкład у развіццё прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, за актыўную грамадскую працу М.В.Ільін неаднаразова ўзнагароджваўся Ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі, ён лаўрэат прэміі імя Н. К. Крупскай. У год 60-годдзя сістэмы прафтэхадукацыі Міхаіл Васільевіч узнагароджаны Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Мікола МІНЗЕР.

Экспрэс-падручнік

Чалавек. Грамадства. Дзяржава

Вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйнай школы з беларускай мовай навучання пад рэдакцыяй доктара філасофскіх навук прафесара Ю.А.Харына

(Заканчэнне. Пачатак у №№ 3, 4, 8, 11)

§ 6. Навука і навуковыя карціны свету

Вытокі навукі

Важнейшай формай праяўлення інтэлектуальнай свабоды чалавека, поруч з філасофіяй, з'яўляецца навука. Яе вытокі ў выглядзе вызначаных сістэм рацыяналістычных ведаў бяруць пачатак у глыбокай старажытнасці. Егіпцяне, напрыклад, умелі рабіць арыфметычныя дзеянні з дробамі, а шумеры — рашаць квадратныя ўраўненні з двума невядомымі. Аднак гэта яшчэ не было навукай. А ўсё таму, што вучэнні Старажытнага Усходу нічога не даказвалі і нічога не тлумачылі. Яны толькі выкарыстоўвалі інтэлектуальныя схемы і прыёмы (якія сфарміраваліся ў працэсе развіцця шматвяковай практыкі папярэднікаў) для вырашэння канкрэтных задач па прынцыпу: "вазьмі тое, зрабі так і ты атрымаеш патрэбны вынік" і не задумвайся над пытаннем "чаму?".

Гэту абмежаванасць мыслення старажытнаўсходніх вучоных заўважылі і хутка выправілі грэкі. Для іх веды мелі значэнне но толькі для практыкі, але і самі па сабе — як гульня розуму. Такія адносіны да ведаў дазволілі вучоным ставіць і даследаваць праблемы ў агульным выглядзе, г. зн. тэарэтычна. Тэорыя — *гэта, такая форма прадстаўлення ведаў, якая дае рацыянальнае тлумачэнне з'яў рэчаіснасці, іх сувязей і адносін.* Стварэнне тэорыі было адным з важнейшых дасягненняў старажытнагрэчаскага генія.

Першапачаткова старажытнагрэчаская навука развівалася ва ўлонні філасофіі. У школах Піфагора, Платона, Арыстоцеля, акрамя ўласна філасофскіх, абмяркоўваліся і канкрэтныя навуковыя праблемы. Да перыяду антычнасці адносіцца вучэнне дзвюх фундаментальных ідэй, якія сталі праграмнымі для ўсяго далейшага развіцця навукі. Адна — гэта гіпотэза *Парменіда* аб адсутнасці ў свеце пустаты; другая, супрацьлеглая ёй,— вучэнне *Дэмакрата* аб атамах і пустаце. Гэтыя ідэі, што здавалася б, выключалі адна адну, былі ўспрыняты сучаснай фізікай і знайшлі адлюстраванне ў розных яе тэорыях.

Паступова на працягу IV — 1 стст. да н. э. навука пачынае ператварацца ў самастойную пазнавальную сілу. Яна аддзяляецца ад філасофіі і дыферэнцыруецца на канкрэтныя дысцыпліны — матэматыку, астраномію, геаграфію, логіку, механіку, а таксама гісторыю, рыторыку, філалогію і інш. Дасягненні антычных вучоных (*Еўдокса, Еўкліда, Гіпакрата, Герадота, Фукідзіда, Эратасфена, Арыстарха, Архімеда*) назаўсёды сталі дасягненнем сусветней культуры. Сярод іх асобае месца належыць геаметрыі Еўкліда. Яна стала своеасаблівым эталонам пабудовы навукова-тэарэтычных ведаў і аказала вялікі ўплыў на мысленне вучоных наступных эпох.

Знамянальны ў гэтай сувязі такі факт; пасля вынаходніцтва кнігадрукавання (сярэдзіна XV ст.) "Пачаткі" Еўкліда ў розных краінах перавыдаваліся больш за 1000 разоў. Тут з гэтай кнігай можа канкураваць толькі Біблія.

Самі старажытныя грэкі свае навуковыя вынаходніцтвы разглядалі ў якасці ўдакладнення і дапаўнення філасофскіх уяўленняў аб свеце і рэдка выкарыстоўвалі іх для рашэння канкрэтных практычных задач (Архімед быў адным з нямногіх выключэнняў). У гэтым заключаецца своеасаблівасць і разам з тым абмежаванасць антычнай навукі.

У перыяд сярэдневякоўя навука знаходзіцца ў заняпадзе, і толькі ў эпоху Адраджэння пачынаецца яе росквіт. Менавіта ў гэты час адбываецца фундаментальнае пераасэнсаванне чалавекам свайго асабістага вобразу і месца ў свеце. Ён пачынае разглядаць сябе ў якасці свабоднага творцы, полем дзейнасці якога з'яўляецца ўвесь свет. Бурная творчая дзейнасць, якая ахапіла грамадства, знайшла рэалізацыю ў мастацтве, вялікіх геаграфічных адкрыццях, тэхнічных вынаходніцтвах, рэфармацыі, перагледзе тысячагадовых уяўленняў пра будову Сусвету.

Класічная навука

На хвалі кардынальных змен у жыцці і светапогляде грамадства, якія адбыліся ў XV і XVI стст., нарадзілася сучасная навука (XVII ст.). Яе "хросным бацькам" прынята лічыць *Галілея* (1564—1642). Новая класічная навука, у адрозненае ад старажытнагрэчаскай, пачала арыентавацца не проста на апісанне рэчаіснасці, а на адкрыццё і ўстанаўленне законаў прыроды. Свае вывады (у выглядзе матэматычных ураўненняў) яна пачала асноўваць на вопыце, эксперыменце. Ньютан (1643—1727), каб падкрэсліць значнасць эмпірычных фактаў пры пабудове свайго вучэння аб фізічнай прыродзе, пастаянна паўтараў: "Домыслаў не стварае".

Яшчэ адным важным адрозненнем новаеўрапейскай навукі ад старажытнагрэчаскай з'яўляецца тое, што вучоныя Новага часу сэнс сваіх навуковых заняткаў бачылі ў магчымасці выкарыстаць атрыманыя веды на практыцы. Тады і ўзнік афарызм: "Веды — сіла". *Паяўленне навукі ў выглядзе эксперыментальнага прыродазнаўства дало чалавеку моцны інструмент для рэалізацыі сваіх імкненняў і ідэалаў.* Вельмі хутка (ужо ў XVIII—XIX стст.) навуковыя адкрыцці, якія матэрыялізаваліся ў тэхніцы, вытворчасці, зброі, транспарце, сродках сувязі, прадметах быту і г. д., пачалі кардынальна мяняць не толькі лад жыцця людзей, грамадства і дзяржавы, але і выгляд планеты. У цяперашні час праз дасягненні навукі чалавек валодае такім патанцыялам уздзеяння на асяроддзе, які можна параўнаць з энергіяй прыродных стыхій.

Важнейшая рыса класічнай навукі — гэта імкненне да аб'ектыўнай ісціны, выпрацоўкі і пастаяннага ўдасканалення, абнаўленні ведаў. Прычым найбольш маштабна гэты працас адбываецца ў перыяд так званых навуковых рэвалюцый. Рэвалюцыі ў навуцы адбываюцца тады, калі якія-небудзь факты немагчыма растлумачыць з дапамогай старых тэорый. Так, напрыклад, было ў фі.зіцы ў XVII ст. і на рубяжы XIX — XX стст. У такіх выпадках вучоныя ствараюць новыя тэорыі, якія дазваляюць здымаць гэтыя супярэчнасці. У выніку — старая карціна свету дае месца новай.

Самым істотным у навуковай карціне свету з'яўляюцца ўяўленні аб найбольш фундаментальных якасцях Сусвету — атамах, элементарных часціцах, вакууме, прасторы, часе, развіцці, тыпах узаемасувязі і т.п. Так, ядром класічнай навукі (XVII – XIX стст.) была фізіка. Адпаведна яе ўяўленням Сусвет складаецца з непадзельных атамаў, якія рухаюцца ў пустаце і ўзаемадзейнічаюць адзін з адным згодна з законамі механікі. Гэтыя законы вечныя і нязменныя. Таму ёсць тэарэтычная магчымасць разлічыць і прадказаць усё, што было, ёсць і будзе. А як аднесціся да "свету" чалавека? Яго развіццё таксама падпарадкоўваецца законам навакольнага свету? Чалавек амаль да сённяшняга дня выпадае з агульнай схемы развіцця свету і таму застаецца як бы сам на сам з сабой. У адпаведнасці з гэтым светаразуменнем ён і дзейнічаў, не хвалюючыся аб наступствах.

Неабходнасць каштоўнаснай пераарыентацыі

Розуму, які пазнае

Рэвалюцыя ў прыродазнаўстве (фізіцы, астраноміі, хіміі, біялогіі) XX ст., з'яўленне новых навук (кібернетыкі, тэорыі сістэм, сінергетыкі) прывялі да карэннага перагляду класічнай навукі. Сёння навука дазваляе глыбей і больш фундаментальна зразумець пабудову, працэсы і законы навакольнага свету. У Сусвеце,—гаворыць яна,—усё ўзаемазвязана, пастаянна развіваецца і змяняецца, у тым ліку матэрыя, прастора, час.

Наша Зямля — часцінка вялікага цэлага — Космасу. Яе існаванне падпарадкавана агульным законам светабудовы. Але разам з тым Зямля з'яўляецца і аўтаномным касмічным аб'ектам — са сваімі ўласнымі адносінамі паміж часткамі, якія яго ўтвараюць (жывой і нежывой прыроды), і законамі эвалюцыі. Грамадства, чалавек — яшчэ адзін элемент складанай, рухомай планетнай сістэмы. Ён можа быць яе арганічнай часткай — як усе даіндустрыяльныя цывілізацыі старажытнага свету, антычнасці і сярэднявякоўя. А можа і супрацьпаставіць сябе, адгарадзіцца ад яе тэхнікай індустрыяльнай цывілізацыі (з Новага часу), тэхнікай, якая забяспечвае чалавеку камфорт, зручнасць, бяспеку. І тут узнікае пытанне: наколькі далёка можа зайсці гэта супрацьпастаўленне і супрацьстаянне, да чаго яно можа ў выніку прывесці?

Яшчэ не так даўно здавалася, што чалавек можа не лічыцца з законамі сістэмнага цэлага, якім з'яўляецца наша Зямля (*біясфера*). Аднак вопыт XX ст. (экалагічныя, дэмаграфічныя праблемы) і сучасная навука гавораць аб неабходнасці кардынальнага перагляду такіх адносін чалавека да свету і яго месца ў ім.

Сёння ўсім вядома, што актыўнасць чалавека выклікае пэўныя змены ў біясферы планеты. Яны назапашваюцца год за годам, дзесяцігоддзе за дзесяцігоддзем. У выніку біясфера Зямлі робіцца ўсё больш няўстойлівай, ёй усё больш складана самааднавіцца. Вядома таксама, што існуе мяжа гэтай ёе магчымасці. Калі гэта мяжа будзе парушана (напрыклад, у выніку вялікай тэхнічнай катастрофы або лакальнай вайны), тады біясфера Зямлі можа выйсці са стану няўстойлівай раўнавагі і беззваротна змяніцца. І немагчыма прадказаць, што здарыцца з прыродай у выніку такіх змен і ці знойдзецца месца чалавеку ў такім асяроддзі.

Такая карціна свету і разуменне працэсаў, якія адбываюцца у ім, патрабуюць ад грамадства пераацаніць свае каштоўнасці і перагледзець стратэгію развіцця. Выбар тут просты: або чалавецтва будзе працягваць выпрабоўваць трываласць біясферы і ў выніку абавязкова прыйдзе да планетарнай катастрофы, або знойдзе сілы, спосабы і магчымасці саступіць у нечым і выбраць жыццё. На жаль, навука тут можа толькі папярэджваць, а не вызначаць.

Рашаючае слова ў сучасным крызісным стане біясфернай няўстойлівасці належыць, зразумела, чалавеку і перш за ўсё развітым краінам. Менавіта на іх прыпадае асноўны аб'ём спажывання планетарных матэрыяльных і энергетычных рэсурсаў,—з аднаго боку, і забруджаняя асяроддзя,— з другога.

Так, жыхары ЗША складаюць толькі 5% насельніцтва Зямлі, а спажываюць 20% усіх сусветных рэсурсаў, пры гэтым выкідаюць у біясферу 30% агульнай колькасці сусветных адходаў. Ці захочуць амерыканцы зменшыць свой "апетыт" на карысць усеагульнага інтарэсу — гэта пытанне.

Сёння для пераадолення крызісу маюць значэнне не столькі дадатковыя веды і навейшыя тэхналогіі, колькі змены ў свядомасці людзей, іх аб'яднаныя дзеянні на аснове каштоўнасцей гуманізму і адказнасці. У будучыню заўсёды вядзе некалькі дарог. Зараз чалавецтва знаходзіцца на развілку. Вялікі рускі вучоны У. І. Вярнадскі (1863—1945), стваральнік вучэння аб біясферы і яе эвалюцыі, калі думаў аб перспектывах чалавечай цывілізацыі, прапанаваў ідэю наасферы як найбольш аптымальнай формы суіснавання прыроды і грамадства. (*Наасфера* — тая ж біясфера, але пераўтвораная чалавекам на аснове навуковых ведаў.) Гата ідэя і цяпер не згубіла сваёй актуальнасці і цалкам магла б стаць мэтай аб'яднанага чалавецтва.

Вывады. *1. Навука — спецыялізаваны від інтэлектуальнай дзейнасці людзей, які скіраваны на вытворчасць новых ведаў аб прыродзе, грамадстве, культуры і чалавеку. 2. Асноўныя рысы навуковых ведаў — сістэмнасць, даказальнасць, магчымасць эксперыментальнай праверкі, пастаяннае абнаўленне. 3. Сучасны навуковы светапогляд арыентуе чалавека на дасягненне арганічнага суіснавання з прыродай.*

Слоўнік

Біясфера — абалонка Зямлі, якая пераўтворана жыццём.

Закон — агульная, устойлівая, істотная, неабходная сувязь, якая паўтараецца, з'яў, працэсаў, падзей.

Карціна свету — уяўленне аб універсуме (усім, што існуе) у цэлым (яго найбольш фундаментальных законах, з'явах і працэсах).

Сістэма — сукупнасць частак, элементаў, якія пэўным чынам звязаны паміж сабой і ўяўляюць нешта цэласнае.

1. Якія былі асаблівасці антычнай навукі?
2. Раскрыйце сэнс паняцця «класічная навука». Калі і чаму яна ўзнікла?
3. У чым заключаецца тэарэтычны і практычны сэнс навуковых ведаў для грамадства? Асобнага чалавека?
4. Супастаўце навуковы светапогляд Новага часу і сучасны. Якое месца ў іх адведзена чалавеку?

ПРАКТЫКУМ

ПАДУМАЙЦЕ

1. Растлумачце на прыкладах сэнс наступнага выказвання

Гётэ: "Навука ў агульным заўседы адыходзіць ад жыцця і вяртаецца да яго абходным шляхам".

2. Сёння навуку параўноўваюць з вядомым джынам, якога выпусцілі з бутэлькі. Ці ўзмацняе навука драму чалавечага быцця? (...) На працягу апошніх стагоддзяў людзі бачылі ў прагрэсе навук праяўленне гуманнага пачатку, зведвалі давер да іх. Вытокі навукі ў глыбінях чалавечай душы, у імкненні да пазнання. Ускладаць на навуку адказнасць за жорсткасці сучаснага чалавека — значыць пераносіць цяжар злачынства з забойцы на зброю злачынства. Усё гэта не мае адносін да навукі. Аналіз чалавечай свядомасці не павінен прыводзіць да абвінавачвання навуковых метадаў. Мы толькі адыдзем у бок, калі будзем перакладваць на навуку адказнасць за скажэнне чалавечых каштоўнасцей. (Г. Башляр, французскі вучоны, філосаф.)

Падумайце над гатымі словамі вучонага і адкажыце на наступныя пытанні: чаму навуковыя веды часта выкарыстоўваюцца ў антыгуманных мэтах? Хто ў гэтым павінен? Што трэба зрабіць, каб навука служыла толькі дабру?

ПРЫСЛУХАЕМСЯ

Навука зусім не з'яўляецца калекцыяй законаў, зборам нязвязаных фактаў. Яна з'яўляецца стварэннем чалавечага розуму з яго свабодна вынайдзенымі ідэямі, паняццямі.

А.Энштэйн

Тэорыя і эксперымент непазбежна ідуць побач, прычым усякі рух наперад звязаны з прыняццем нейкай спецыяльнай гіпотэзы.

Дж.Прыстлі

У эксперыментальных працах неабходна сумняваццa да таго часу, пакуль факты не прымусяць адмовіцца ад усякіх сумненняў.

Л.Пастар

Метад — самая першая, самая асноўная рэч у навуцы. Ад метаду, спосабу дзеяння залежыць уся сур'ёзнасць даследавання. Уся справа ў добрым метадзе, метад трымае ў руках лёс даследавання.

І. Паўлаў

Кожны, вялікі перыяд у гісторыі прыродазнаўства прыводзіць да новай мадэлі прыроды. Для класічнай навукі такой мадэллю быў гадзіннік, для XIX ст.— паравы рухавік. Што стане сімвалам для нас? Наш ідэал, відаць, найбольш поўна выяўляе скульптура.

І.Прыгожын

Што можна прачытаць

Мир философии. Кн. для чтения. Ч.Н. М, 1999.

Человек. Общество. Культура. Наука: Афоризмы, Мн., 1999.

§ 7. Ісціна навуковых ведаў і праўда жыцця

Ісціна — каштоўнасць чалавека

Людзі заўсёды імкнуліся да ісціны. Яны ўзвялічвалі тых, хто пераконваў, што ведае да яе дарогу. Шлях да ісціны паказвалі ў свой час Канфуцый, Буда, Хрыстос, Мухамед, Маркс, Леў Талстой. Гандзі.

У кожнага з іх была свая "ісціна". І не проста разабрацца, чыя "ісціна" была больш правільнай і важнай. А яшчэ вядомы ісціны навуковых ведаў — законы Ньютана і тэорыя адноснасці Эйнштэйна, вучэнне аб паходжанні відаў Дарвіна і перыядычная сістэма хімічных элементаў Мендзялеева і інш.

У канцы 80-х гг. XX ст. сярод айчынных папулярных эстрадных спевакоў выдзяляўся Віктар Цой. Ён быў кумірам моладзі, асабліва старэйшых школьнікаў. Калі ў 1990 г. артыст трагічна загінуў у аўтадарожнай катастрофе, фанаты, якія былі ўзрушаны горам, пісалі на сценках і агароджах:

"Цой — ты адкрыў нам шлях да ісціны". Песні Віктара Цоя ўспрымаліся імі як прасвятленне ў поглядзе на ўласнае жыццё і супярэчнасці навакольнага асяроддзя.

А ці ж вы самі не спрабавалі "шукаць ісціну", калі думалі над сэнсам уласнага жыцця, у спрэчках з сябрамі, калі супастаўлялі думкі?

Ісціна — адна з вышэйшых духоўных чалавечых каштоўнасцей, вянец назнаваўчых патрэб і дзеянняў людзей. "Ісціна,— пісаў Гегель,— ёсць вялікае слова і яшчэ больш вялікая справа. Калі дух і душа чалавека яшчэ здаровыя, у яго пры гуках гэтага слова павінны вышэй уздымацца грудзі". З зерня сапраўдных ведаў расце багацце культуры і магутнасць тэхнікі, да ісціны звяртаюцца тыя, хто імкнуўся і імкнецца да свабоды і прасвятлення Розуму. Змагары за ісціну ішлі на эшафот і на вогнішчы інквізіцыі. Цяпер вучоных не спальваюць, як гэта было з Джардана Бруна 400 гадоў таму. Але ці стала людзям больш ясным пытанне аб ісціне? Ісус сказаў:

"Я ёсць шлях, ісціна і жыццё". Але таксама ўпэўнены ў правільнасці сваёй веры тыя, хто прытрымліваецца нехрысціянскіх поглядаў. Атрымліваецца, што ў грамадстве ў розных людзей свае ісціны?

Ісціна і інтарэсы людзей

Вядомы англійскі палітык У. Чэрчыль некалі заўважыў:

"Праўда настолькі каштоўная, што яе павінен суправаджаць цэлы эскорт хлусні". Выказванне нібыта жартоўнае. Але Чэрчыль ведаў, што гаварыў. Людзі далёка неабыякавыя ў пытанні аб ісціне, асабліва калі гэта датычыцца іх інтарэсаў. У карысліных мэтах ісцінай яны могудь грэбаваць. Таму невыпадкова ў адносінах да грамадскіх з'яў шырока ўжываецца слова "праўда".

Праўда — тая ж ісціна. Агульнае у іх — несумяшчальнасць з хлуснёй і падманам. Але ёсць ў значэнні гэтых слоў некаторая розніца. У беларускай і рускай мовах слова "ісціна" паходзіць ад дзеяслова "быць" —вытворнае "ёсць", "быць у наяўнасці". Таму і гавораць: *быць ісцінай —адпавядаць сапраўднасці. У той жа час у слове "праўда" як бы зліваюцца ў адно два паняцці — "ісціна" і "справядлівасць".*

Людзі розных сацыяльных груп і класаў могуць мець розныя ўяўленні аб справядлівасці. Гэта тлумачыцца рознымі патрэбнасцямі і інтарэсамі. Таму можна сказаць, што *праўда — гэта напоўненыя асабістымі інтарэсамі і прыватным сэнсам веды.*

Мая праўда

Кожнаму з нас неабходна адрозніваць ісціну навуковых ведаў і праўду жыцця. Ісціна процістаіць памылковым поглядам, здагадкам і думкам. Праўда ж успрымаецца як веды, што прыведзены ў дзеянне і сталі перакананнямі. Ісціна — "нічыя", агульная. А праўда— асабістая, "наша", "мая". Часцей за ўсё людзі змагаюцца не за "голую" ісціну, а за "сваю" праўду. Ісціна адзіная, адна і непадзельная. Праўда — шматаблічная, бывае і паўпраўда. Ісціну падтрымлівае "логіка розуму", а праўда жыве па "логіцы сэрца". Ісціна даказваецца навуковымі пошукамі, з ёю вы знаёміцеся на ўроках у школе, яна — аснова поспеху чалавечых дзеянняў. Праўда засвойваецца вамі па меры стаўлення — у сям'і, у зносінах з сябрамі, у працэсе набыцця жыццёвага вопыту, пад уплывам сацыяльнага асяроддзя і пры ўсведамленні асабістых інтарэсаў.

Паняцце "ісціна" звычайна ўжываецца ў навуковых даследаваннях. Яна выпрацоўваецца ў працэсе пазнання рэчаіснасці праз пачуцці і сілай лагічнага мыслення. Слова "праўда" часцей за ўсё сустракаецца ў мастацтве, рэлігіі, у ацэнцы маральных з'яў. У мастацтве, напрыклад, праўда "ствараецца" фантазіяй і ўяўленнем. Не існавала ж у сапраўднасці ні Таццяны Ларынай, ні П'ера Бязухава, ні Сымона Музыкі... Але мастацкі вымысел вялікіх пісьменнікаў і паэтаў сфакусіраваў у іх вобразах яркія з'явы духоўнай культуры.

Дагматыка ("праўда") рэлігіі сцвярджаецца сілай веры і ўнушэння. Любая рэлігія не большая ісціна, чым усе астатнія. Але ў адрозненне ад навукі як навукі як сістэмы сапраўдных ведаў рэлігійныя вучэнні прадстаюць толькі як сэнсажыццёвыя каштоўнасныя арыенціры. Яны ў нейкай ступені дапамагаюць многім людзям у жыцці. Як піша яўрэйскі мысліцель М. Бубер, "усё магчыма веруючаму".

Рэлігійныя людзі перакананы ў праўдзівасці і справядлівасці боскага вучэння, яны імкнуцца яго прытрымлівацца. У пазнанні Бога веруючы бачыць задачу і мэту чалавечага жыцця, у адкрыццях Бога — уся праўда. Яшчэ ў перыяд ранняга хрысціянства паслядоўнікі Ісуса свой вобраз жыцця проста называлі "ісцінай" або "шляхам ісціны". Да нашых дзён дайшоў звычай завяршаць успамін аб прароцтвах і запаведзях Бога выразам "амінь" ("ісціна"). А мусульмане паўтараюць радкі Карана: "Сапраўды, Алах аб усякай рэчы ведае". Аднак рэлігійныя ісціны носяць абстрактны характар, таму што, напрыклад, той жа заклік Хрыста "не забі" — бясспрэчны па сваёй сутнасці — ніяк не можа быць ажыццёўлены пры пастаянных войнах і гвалце над асобай, што суправаджаюць чалавецтва.

Як няма ў свеце людзей абсалютнай ісціны, так і не можа быць паўісціны. У жыцці вельмі часта людзі выкарыстоўваюць паўпраўду, замоўчваюць праўду, дапускаюць хлусню і падман. Зразумела, у некаторых выпадках гэта дапусціма і нават неабходна. Напрыклад, дэзінфармацыя праціўніка пры баявых дзеяннях або дабрадзейны падман смяротна хворага чалавека. Але рэзкае маральнае асуджэнне выклікае ў людзей прамая хлусня. Шкада толькі, што некаторыя з іх прызвычаіліся да гэтага амаральнага прынцыпу "не падманеш—не прадасі". І ў сродках масавай інфармацыі, у газетах, на радыё і тэлебачанні цяпер нярэдка за ісціну выдаюць адкрытыя выдумкі.

Таму вельмі важна, каб у грамадстве існавалі "фільтры", якія маюць магчымасць аддзяліць у нашых ведах праўду ад хлусні, ісціну ад памылак. Іх функцыю ў многім выконвае вопыт, практыка. Гэта дзеянні людзей у сферах палітыкі і эканомікі, навуковыя эксперыменты, жыццёвыя нагляданні і інш. Інакш кажучы, сапраўднасць нашых ведаў пацвярджаецца грамадска-гістарычнай практыкай, вынікамі сукупнай дзейнасці людзей.

Крытэрый жыццёвай праўды

Практыкай правяраецца не толькі сапраўднасць нашых ведаў, але і праўда жыцця. Аднак тут выключную важнасць маюць асобасныя крытэрыі. Аб чым ідзе размова? Ёсць людзі, у якіх слаба развіта здольнасць да крытычнага мыслення, яны празмерна паддаюцца ўнушэнню. Яны думаюць "як усе". Таму, напрыклад, у часы сярэдневяковай інквізіцыі такі чалавек, упэўнены ў тым, што ерэтыка караюць правільна, падкідваў дровы ў вогнішча. А сёння такія людзі пераказваюць як перажытую імі ісціну, узятыя з газет або б

Твае выхаванцы, школа!

Дзівосныя мелодыі Дзінары Мазітавай

Я глыбока ўпэўнены ў тым, што творчасць пераўтварае свет. Музыка таленавітага кампазітара дорыць людзям эстэтычную асалоду, хвалюе, захапляе. Зразумела, бывае і па-іншаму. Часам слухаеш у зале гэтакі экстравагантны мадэрнісцкі шэдэўр і разгублена пытаешся ў сябе: "Ці я яшчэ не дарос да аўтара, ці ён занадта перарос мяне?" Недарэчная сітуацыя.

На канцэртах Дзінары Мазітавай так не здараецца. Гэтая дзяўчынка пачала сачыняць музыку ў сямігадовым узросце і вось ужо амаль дзесяць гадоў, не збочваючы, ідзе па абранай сцяжыне. Яе музыка не страчвае свежасці і яркасці, цешыць і захапляе. Мелодыі Дзінары абуджаюць уяўленне людзей, не перастаюць падабацца.

Пацвярджэннем таму служаць аўтарскія канцэрты маладога таленту, якія адбыліся ў яе родным горадзе Лідзе, а таксама ў Лідскім раёне напярэдадні Каляд і Новага года.

Цяпер Дзінары Мазітавай 16 гадоў, яна вучыцца ў 11 класе Рэспубліканскага комплексу гімназія-каледж пры Беларускай акадэміі музыкі. Нягледзячы на маладосць, гэта сапраўдны кампазітар і цудоўная піяністка. Менавіта таму Гродзенская філармонія рызыкнула наладзіць шэраг пробных канцэртаў. І не памылілася! Выступленні Дзінары ў сярэдніх школах і дзіцячых садах без перабольшання можна назваць трыумфальнымі. Дзеці з рэдкім энтузіязмам прымалі яркую, жывую, вобразную музыку беларускай "зорачкі". Яна напісала дзве оперы і тры балеты, дзесяткі (калі не сотні!) твораў для фартэпіяна, скрыпкі, віяланчэлі, флейты, мноства песень і рамансаў на вершы ўсходніх, рускіх і беларускіх паэтаў. Гэта ўжо творчы набытак дарослага кампазітара, а не вучаніцы школы!

З вялікай цікавасцю прымалі музыку Дзінары вучні Лідскага педагагічнага вучылішча. Ім, будучым выкладчыкам, выпала рэдкая магчымасць пазнаёміцца з цяперашнім узроўнем развіцця дзяцей, больш даведацца пра тое, чым жыве сучасны адораны малады чалавек. Гэта, безумоўна, спатрэбіцца ім у будучай самастойнай рабоце. Нельга не ўзгадаць новага дырэктара педвучылішча Наталлю Яўгенаўну Кудзерка. Яна нязменна праяўляе клопат і ўвагу да творчых людзей, сочыць за прагрэсіўнымі тэндэнцыямі ў сучаснай педагогіцы. Ці трэба гаварыць, што яна ахвотна згадзілася арганізаваць вечар Дзінары ў сваёй навучальнай установе!

Наступнае выступленне адбылося ў Бярозаўскай музычнай школе, дзе Дзінара як ганаровы госць адкрыла новую канцэртную залу. Прыемна здзівілі добрая акустыка памяшкання, цудоўны раяль і ўважлівая публіка. Пасля канцэрта некаторыя з дзяцей выказалі жаданне самім пісаць музыку. І такая магчымасць у іх з'явілася дзякуючы дырэктару школы Вяславе Іванаўне Сычэўскай. І хто рызыкне сцвярджаць, што творчасці не пад сілу змяніць наша жыццё?

Не менш уважліва прымалі Дзінару самыя юныя слухачы ў дзіцячых садках. Яны імгненна пазнавалі кожны вобраз у яе п'есах: Зіму, Восень, Вясну ці Лета. Як двух-, так і пяцігадовыя дзеткі зноў і зноў прасілі сыграць такія мініяцюры, як "Варона і Верабей", "У лесе", "Танец птушак", "Конік". Іх захапленню не было межаў. У сваю чаргу і Дзінару здзівілі прыбраныя, цёплыя, упрыгожаныя зеляніной памяшканні, дзе гуляе і вучыцца дзятва. Як не падзякаваць загадчыцы ясляў-сада № 29 Святлане Іванаўне Дадзьковай, супрацоўніцы Галіне Сіманаўне Шукалавай, музычнаму кіраўніку Людміле Іванаўне Парфёнавай! Гэтыя высокакваліфікаваныя спецыялісты робяць усё для гарманічнага развіцця падрастаючага пакалення, прывіваюць малышам чалавечнасць і любоў да прыгожага.

Асабліва прыемнай і запамінальнай была сустрэча ў роднай лідскай школе № 17, дзе Дзінара Мазітава вучылася перад тым, як паехаць у Мінск. Яе дырэктар Галіна Якаўлеўна Бахтэрыт заўсёды выказвала павышаную ўвагу да выключна адоранай дзяўчынкі, што дало магчымасць дзіцяці паспяхова сумяшчаць вучобу ў агульнаадукацыйнай і музычных школах, неаднаразова выязджаць на канцэрты, фестывалі, конкурсы. Не дзіўна, што дырэктар і цяпер прыняла сваю нядаўнюю вучаніцу сардэчна і цёпла.

З музыкай Дзінары таксама пазнаёмілася моладзь Лідскага музвучылішча, Лідскай музычнай школы, сярэдніх школ № 4 і 14 і малышы ясляў-сада № 27.

Упершыню на Беларусі музыка маладога аўтара была так шырока прадстаўлена падчас гастроляў. Творчасць Дзінары Мазітавай — важкі ўклад у скарбніцу нацыянальнай культуры, немалы ўнёсак у справу маральнага і эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення. Так, у канцэртную праграму былі ўключаны ўрыўкі з оперы "Чароўная флейта", фрагменты з балетаў "Дзюймовачка" і "Торт у небе", сюіты "У лесе", "Нязнайка і яго сябры", "Усходнія танцы", "Сельскія сцэны", рознахарактарныя п'есы.

Музыка маладых і для маладых — гэта, бадай, найбольш дзейсны і эфектыўны сродак у прапагандзе музычнага мастацтва. Гастролі Дзінары Мазітавай адкрылі новую сферу, дзе юныя беларускія выканаўцы і кампазітары маглі б рэалізоўваць свой талент. А такіх самародкаў у нас нямала, і Дзінара зусім не выключэнне. Тым не менш нашы будучыя знакамітасці грэбуюць беларускай глыбінкай, іх вабяць канцэртныя залы еўрапейскіх сталіц! Няправільнае і ў нечым амаральнае імкненне. Не аддаўшы доўг таму грамадству, якое цябе ўзгадавала і ўскарміла — дачасна шукаць сытнага хлеба за мяжой. Дзінара з рэдкай самааддачай радуе слухачоў у сябе на радзіме, дорачы равеснікам магчымасць ацаніць вынікі сваёй 10-гадовай кампазітарскай працы.

Цяперашнія гастролі былі наладжаны Гродзенскай абласной філармоніяй (дырэктар Эдуард Ціховіч) пры садзейнічанні саветніка-кансультанта Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ніны Паўлаўны Марчанка. Прыемная магчымасць адкрываць і весці канцэрты Дзінары Мазітавай выпала і мне, яе настаўніку па кампазіцыі.

А ў заключэнне прывяду некалькі водгукаў удзячных слухачоў.

"На ўроках методыкі музычнага выхавання часта даводзіцца падбіраць музыку для дашкольнікаў. Галоўнае патрабаванне да яе — даступнасць і вобразнасць. Канцэрт Дзінары Мазітавай я б назвала праграмным. Яна выконвала менавіта такую музыку — яркую, выразную, запамінальную" (Святлана Фельдман, выкладчык Лідскага педвучылішча).

"Яе музыка зачароўвае, пераносіць маленькіх слухачоў у казачны свет, поўны дабра і хараства, які такі блізкі і зразумелы дзецям" (Людміла Парфёнава, музычны кіраўнік ясляў-сада № 29).

"Нам вельмі спадабаліся цудоўныя мелодыі, прыдуманыя Дзінарай. Ёсць з каго браць прыклад". "Уся школа ганарыцца тым, што Дзінара была нашай вучаніцай". "Запрашаем Дзінару зноў да нас у госці. Будзем чакаць з нецярплівасцю" (Вольга Раманоўская, Наташа Капачэль, Ганна Смоліч, вучаніцы сярэдняй школы № 17).

Віталь РАДЫЁНАЎ,
старшыня Асацыяцыі кампазітараў Гродзеншчыны.

НА ЗДЫМКУ: Дзінара Мазітава.

Праграма тэлеперадач

СУБОТА, 3 ЛЮТАГА

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

7.00 Навіны. 7.10 Сутнасць.
7.35 "Авантура імпрэсіяністаў". Перадача 2-я цыкла "Музей Арсе".
8.30 Здароўе. 9.00 Навіны.
9.15 "Легенда пра Беласнежку". Мультсерыял.
9.45 "Шукальнікі золата" (Міжнародны Французскі Канал). 8-я серыя, заключная.
10.35 "Усё нармальна, мама!".
11.05 "Адысея каманды Кухто".
11.35 Мультыклуб.
12.00 "Архідэя Беларусі". Дак. фільм.
12.25 Ток-шоу "Будні".
13.10 Каралеўскае паляванне.
13.40 "На грэбені хвалі".
14.30 Сталіца.
15.00 Навіны.
15.10 "Зорка чароўнага шчасця". 1-я і 2-я серыі. 17.50 Вечар з Андрысам Ліепай. Муз. праграма.
18.35 "З дакладных крыніц".
19.00 Навіны.
19.20 "Жулі Ляско". 6-я серыя.
21.00 Панарама. 21.50 Спорт-кур'ер.
22.00 "Тайныя спружыны палітыкі". Аўтарская праграма Ю. Азаронка.
22.20 Прыгодніцкі фільм "Дэрсу Узала".
0.35 Вячэрні экспрэс.

ГРТ

7.00 Навіны.
7.10 Праграма "100%".
7.35 Мультфільмы.
7.55 Камедыя "Альф".
8.25 Іграй, гармонік любы!
9.00 Навіны.
9.10 Смак.
9.30 "Смехапанарама".
10.10 Прыгодніцкі фільм "Забудзьце слова "смерць".
11.40 "Андрэй Пятроў: мелодыі любімых фільмаў".
12.35 Сёмае пачуццё.
13.15 Здароўе.
14.00 Навіны.
14.10 "Кітайскі гарадавы".
15.05 "Качыныя гісторыі".
15.35 "Каб помніли..." Андрэй Болтнеў.
16.15 У свеце жывёл.
17.00 Навіны.
17.15 "Жаночыя гісторыі". Л. Чурсіна.
17.50 Новы "Ералаш".
18.05 Дэтэктыў "Каломба і забойства рок-зоркі".
20.00 Час.
20.40 Камедыя "А як жа Боб?".
22.35 Фільм "Пад покрывам нябёсаў".

РАСІЯ

6.30 Дыялогі аб рыбалцы.
6.55 Мультфільм.
8.10 Залаты ключ.
8.30 "Тэлепузікі".
9.00 Добрай раніцы, краіна!
9.45 "Сто да аднаго".
10.35 Сам сабе рэжысёр.
11.05 "Каламбур".
11.35 Пошта РТР.
12.00 "Камісар Рэкс".
13.00 Весткі.
13.20 Дэтэктыў "Чорны прынц".
15.00 "Міжнародная панарама".
16.00 "Прэс-клуб".
17.00 "Мая сям'я".
18.00 "Згублены свет".
19.00 "Весткі" ў суботу.
19.50 "Гарадок".
20.30 Фільм "Добрыя і дрэнныя".
22.10 Крымінальная камедыя "Карты, грошы, два стволы".
0.05 Біятлон. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Спрынт 10 км.

КУЛЬТУРА

9.05 "Буслянят".
9.30 Мой цырк.
9.55 "Бядней за царкоўную мыш". Маст. фільм.
11.35 Сенсацыя. Сенсацыя? Сенсацыя...
12.00 Вандроўкі музыканта.
12.20 Архітэктурная галерэя.
12.35 Залаты п'едэстал. Уладзімір Кондра.
13.00 Палацавыя тайны.
13.30 Навіны культуры.
13.45 Тэатральны летапіс XX стагоддзя. Андрэй Ганчароў.
14.10 "Парыжскія тайны". 3-я серыя.
15.00 Хрустальны камертон. Гала-канцэрт.
15.55 Мультфільм.
16.15 "Карчмарка". Тэлеспектакль.
17.30 Сферы.
18.10 Царская ложа.
18.50 Вячэрняя казка.
18.55 "Ох, ужо гэтыя дзеткі".
19.20 Астравы. С. Райтбурт.
20.15 У вашым доме. Сям'я Брыль.
21.00 Навіны культуры.
21.20 Асабістыя ўспаіны аб вялікім жыцці.
21.25 Блеф-клуб.
22.05 "Плывеці". Маст. фільм.

НТБ

7.00 Сёння.
7.15 "Вуліца Сезам".
7.40 "Закон джунгляў".
8.10 "О, шчасліўчык!".
9.00 Сёння.
9.20 Крымінал.
9.50 "Жаночы погляд".
10.25 "Палундра".
11.00 Сёння.
11.25 Вялікія грошы.
11.55 Фільм "Раскажы мне пра сябе".
13.40 "У нашу гавань заходзілі караблі".
14.40 "Сведка стагоддзя".
15.00 Сёння.
15.25 "Дэпрэсія".
15.50 "Я і мой сабака".
16.20 "Цікавае кіно".
16.55 Серыял "Новыя прыгоды Нікіты". 18.00 Сёння.
18.35 "Адзін дзень".
19.05 "О, шчасліўчык!".
19.50 "Вуліцы разбітых ліхтароў".
21.00 "Усяго".
21.25 Баявік "Адзіночка".
23.10 Серыял "Ахопленыя жахам".

СТБ

7.00 Музычны канал.
7.30 "Спідзі-гоншчык".
8.00 "Сімпсаны".
8.30 "Свет спорту вачамі "Жылет".
9.00 Баявік "Фанат".
11.00 "Безразважнасць храбрых". Частка 4-я.
11.30 "Элі Макбіл". Серыял.
12.30 Навіны СТБ — 24 гадзіны.
12.45 "Альфрэд Хічкок прадстаўляе".
13.15 Баявік "У зоне асаблівай увагі".
15.00 "Анатомія зла".
15.15 "Пахавальная каманда".
15.45 "Спідзі-гоншчык".
16.15 Гурман-клуб на СТБ.
16.35 Музыка на СТБ.
16.45 "Няшчасны выпадак".
17.15 Кінааповесць "Вызваліце Вілі".
19.30 Навіны СТБ — 24 гадзіны.
19.45 Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ.
20.00 "Сімпсаны".
20.30 Дэтэктыў "Проста кроў".
22.35 Музыка на СТБ.
22.50 Футбол. Англійская прэм'ер-ліга.
1.00 Начны музычны канал.

НЯДЗЕЛЯ, 4 ЛЮТАГА

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

7.00 "Трэнер". Дак. фільм.
7.25 Серыял "Жулі Ляско".
9.00 Навіны.
9.15 "Легенда пра Беласнежку".
9.45 "Пра тое, як Колька і Пецька ляталі ў Бразілію". Кароткаметражны маст. фільм.
10.15 "Усё нармальна, мама!".
10.40 "Прэм'ер-парад".
11.10 "Вялікае снеданне".
11.40 Арсенал.
12.05 Кінакамедыя "Вяселле з пасагам".
13.50 Серыял "На грэбені хвалі".
14.35 25-ы кадр. 15.00 Навіны.
15.10 "Сустрэча ў Траецкім" з А. Дамарацкім.
15.40 Крымінальнае дасье.
16.05 Відэафільм "Нёман".
16.45 Маст. фільм "Тры таполі на Плюшчысе".
18.00 Планета "АРТ".
18.30 Міжнародны турнір па таіландскаму боксу.
19.20 Тэленавігатар.
19.40 Тэлебарометр.
20.00 Рэзананс.
21.00 Спорт-кур'ер.
21.15 Камедыя "Калі ласка ў Вуп-Вуп".

ГРТ

6.45 Слова пастыра.
7.00 Навіны.
7.10 Служу Расіі!
7.40 Аладзін".
8.05 Ранішняя зорка.
9.00 Навіны.
9.10 "Бесталковыя нататкі".
9.30 Пакуль усе дома.
10.10 Фільм "Доктар Франсуаза Гаян".
11.45 "Ералаш".
11.55 Ранішняя пошта.
12.25 Клуб падарожнікаў.
13.05 "Эх, Сямёнаўна!".
13.45 Гісторыя аднаго шэдэўра.
14.00 Навіны.
14.10 "Кітайскі гарадавы".
15.05 "Чып і Дэйл".
15.35 Разумніцы і разумнікі.
16.00 Жывая прырода.
17.00 Навіны.
17.20 Камедыя "Белыя Росы".
19.05 Гістарычны баявік "Чалавек у жалезнай масцы".
21.30 Часы.
22.45 "На футболе".
23.25 Фільм "Рускі рэгтайм".

РАСІЯ

6.30 Мультфільм.
8.00 Рускае лато.
8.40 "ТБ Бінга шоу".
9.35 Добрай раніцы, краіна!
10.05 "Аншлаг" і К.
11.00 "Гарадок".
11.30 Федэрацыя.
12.10 Парламенцкая гадзіна.
13.00 Весткі.
13.20 Дыялогі аб жывёлах.
14.20 Вакол свету.
15.20 "Два раялі".
16.20 Сам сабе рэжысёр.
17.00 "Люстэрка".
18.20 Камедыя "Ці не паслаць нам ганца?".
20.15 Фантастычны баявік "Поле бітвы — Зямля".
22.20 Вечар памяці Ю. Візбара.
23.55 Баятлон. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Спрынт 7,5 км.

КУЛЬТУРА

9.05 "ДТА".
9.30 Мультфільм.
10.45 Экспедыцыя "Чыж".
11.10 "Паўночны марскі коцік". Дак. фільм.
12.00 Бабуліны рэцэпты.
12.15 П. Дзюка. "Вучань чарадзея".
12.30 Ток-шоу "Наўздагад".
13.00 Стагоддзе рускага музея.
13.30 Навіны культуры.
13.45 Тэатральны летапіс XX стагоддзя.
14.10 "Парыжскія тайны". 4-я серыя.
15.05 Да 60-годдзя Уладзіслава П'яўко. "Тэнар".
15.55 Тым часам.
16.20 Дак. кіно "Ліліян Гіш".
16.45 Смехаанастальгія.
17.15 "Людзі на масту". Маст. фільм.
18.55 Вячэрняя казка.
19.00 "Ох, ужо гэтыя дзеткі".
19.20 У свеце танца.
20.15 XX стагоддзе. Выбранае.
21.00 Навіны культуры.
21.20 Асабістыя ўспаміны аб вялікім жыцці.
21.25 "Хто там...".
21.50 "Покліч продкаў". Маст. фільм.

НТБ

7.00 Сёння.
7.15 "Вуліцы разбітых ліхтароў".
8.15 "О, шчасліўчык!".
9.00 Сёння.
9.15 Фільм "Вам і не снілася...".
11.00 Сёння.
11.30 Прафесія — рэпарцёр.
11.55 Камедыя "Бум".
13.55 "Трэці тайм".
15.00 Сёння.
15.25 Вялікія бацькі.
15.55 Без рэцэпта.
16.25 Падарожжы натураліста.
16.55 Серыял "Новыя прыгоды Нікіты".
18.00 Вынікі.
19.35 Лялькі.
19.50 "Вуліцы разбітых ліхтароў".
21.00 Вострасюжэтны фільм "Дуэлянты".
22.50 "Ахопленыя жахам".

СТБ

7.00 Музычны канал.
7.30 "Спідзі-гоншчык".
8.00 "Сімпсаны".
8.30 Спартыўны агляд.
8.50 "Манітор".
9.10 Кінааповесць "Вызваліце Вілі".
11.30 "Элі Макбіл".
12.30 Навіны СТБ — 24 гадзіны.
12.45 Чэмпіянат Паўночна-Еўрапейскай баскетбольнай лігі. "Урал-Грэйт" (Перм)—"Жальгірыс" (Каўнас). 15.00 "Ваенная тайна".
15.30 Музыка на СТБ.
15.45 "Пахавальная каманда".
16.15 Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ.
16.30 Музыка на СТБ.
16.45 "Клуб "Белы папугай".
17.15 Фантастычны трылер "Марабунта".
19.30 Інфармацыйная праграма СТБ — 168 гадзін. 20.00 "Сімпсаны".
20.30 Трылер "Імітатар".
23.00 Футбольны кур'ер.
23.20 Фільм "Акцёры".
1.30 Начны музычны канал.

Спорт

Турнір памяці алімпійскага чэмпіёна

У Жлобіне адбыўся лёгкаатлетычны турнір памяці алімпійскага чэмпіёна Васіля Рудзянкова, першага алімпійскага чэмпіёна ў кіданні молата, які паклаў пачатак трыумфу беларускіх кідальнікаў у гэтым відзе спорту. Міхаіла Крываносава, Рамуальда Кліма, А.Балтоўскага, Анатоля Шчуплякова, паслядоўнікамі якіх з'яўляюцца бронзавы прызёр XXVII летніх Алімпійскіх гульняў Ігар Астапковіч, удзельнікі Алімпіяды ў Сідней Іван Ціхон, Вадзім Дзевяткоўскі.

Цікавае і змястоўнае, але кароткае жыццё пражыў Васіль Васільевіч Рудзянкоў. Нарадзіўся 7 мая 1931 года ў Жлобіне, дзе цяпер жывуць яго пляменнік і пляменніца.

Закончыўшы Жлобінскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча, працаваў памочнікам машыніста на перагоне Орша — Жлобін.

Поспех, напэўна, закладваўся ўжо ў той час, бо за паездку туды і назад неабходна было ў топку паравоза перакідаць 50 тон вугалю... Вось дзе патрэбны былі сапраўдная сіла і выносласць. Пачаў Васіль Васільевіч трэніравацца ў Яўгенія Шуневіча сумесна з Міхаілам Краваносавым. І ўжо праз два гады на першай спартакіядзе народаў СССР заняў шостае месца, а на Алімпійскіх гульнях 1960 года ў Рыме стаў чэмпіёнам, устанавіўшы новы алімпійскі рэкорд па кіданні молата — 67 м 10 см, выканаўшы нарматыў майстра спорту. Ён з'яўляецца трохразовым чэмпіёнам СССР у кіданні молата — у 1959, 1960, 1961 гадах.

Працуючы трэнерам, падрыхтаваў 17 майстроў спорту. За вялікія спартыўныя дасягненні Васіль Рудзянкоў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Гэты мемарыял памяці знакамітага спартсмена праводзіўся ў Жлобіне сёмы раз.

Багатая Жлобіншчына выдатнымі спартсменамі. У іх ліку: Уладзімір Лавецкі — сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў у Мюнхене, Мікалай Кіраў — бронзавы прызёр летніх Алімпійскіх гульняў у Маскве, Генадзь Мароз — чэмпіён Еўропы сярод юніёраў 1998 года. Яны сабраліся, каб ушанаваць памяць свайго земляка. І цудоўна, што паралельна з Алімпійскімі гульнямі ў Сіднеі на працягу двух дзён спаборнічалі юныя спартсмены ў розных відах лёгкай атлетыкі.

Каб вітаць іх, прыехалі ганаровыя госці: Алімпійскі чэмпіён у кіданні молата Рамуальд Клім, Заслужаны майстар спорту Анатоль Юлін, удзельнік Алімпійскіх гульняў Анатоль Шчуплякоў (кіданне молата). У спаборніцтвах удзельнічалі каманды з Расіі і Украіны.

Асноўны прыз у кіданні молата разыгралі майстры спорту міжнароднага класа Андрэй Варанцоў, Дзмітрый Шака і чэмпіён свету сярод юніёраў Віталь Алісевіч. Прыз дастаўся Андрэю Варанцову.

Кожны госць атрымаў у падарунак цудоўную жлобінскую мяккую цацку. Імі ж былі ўзнагароджаны і пераможцы ва ўсіх відах спорту.

Ініцыятарамі гэтага турніру памяці былі старэйшы трэнер дзіцяча-юнацкага клуба падрыхтоўкі Уладзімір Сурадноў і дырэктар гэтага клуба Гвідон Сушкевіч.

Фінансаванне спаборніцтваў ажыццяўлялі аддзелы адукацыі гарвыканкама (загадчык Л.І.Артамонава) і спорту і турызму (начальнік А.А.Елісееў). А спонсарамі яго з'яўляліся фабрыка адкрытага акцыянернага таварыства "Белфа", жлобінскія электрасеткі, а таксама аматары лёгкай атлетыкі, якія дапамаглі ў арганізацыі свята спартсменам, трэнерам і гасцям.

Д.ЧАРНЫШОВА,
Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь, майстар спорту міжнароднага класа.

На жыццёвых скрыжалях

"Я ценю за мужам не бачу..."

Усё ж я вырашыў напісаць пра гэту жанчыну, з якой жыў у адным пад'ездзе, з якой сутыкаўся па некалькі разоў на дзень.

Так, яна незвычайнага характару чалавек, жанчына з вялікай літары. Яна — арэол жаноцкай вернасці, той вернасці, за што трэба нізка-нізка пакланіцца ёй у пояс.

Кажу гэта зусім шчыра, з поўнай адказнасцю перад сваім сумленнем. За многія часіны працы ў рэдакцыях газет давялося вока на вока пры розных абставінах сутыкнуцца з нашым прыгожым полам (можа, з цэлай тысячай) і ва ўсіх жанчын былі адны і тыя ж аргументы: разводжуся з-за мужавай нявернасці. Жанчыны розных узростаў і розных прафесій (сярод іх было і нямала з вучонымі ступенямі), гаварылі са мной занадта завучана-гладка, так ужо аргументавалі свае выказванні пра сваіх няверных мужанькоў, што хоць зараз іх без суда і следства трэба ў турму, а то нават прымяніць да іх самую жорсткую кару. Потым высвятлялася, што ўсё гэта — зваротны бок медаля, што ў сямейных перакрыжаваннях, наадварот, вінавата больш яна, чымсьці ён.

...Тады мы жылі ў адным пад'ездзе. Гэта быў далёкі ўскрай Мінска. Я з дзвюма дачушкамі і жонкай туліўся на другім паверсе пяціпавярховага блокавага дома. Яны — з першакласніцай — "замыкалі" самы вышэйшы — пяты паверх нашага дома. Сусед моў — Мікалай Дзянісавіч — (я ж яго заўжды зваў Коля-Колечка) быў заўсёды са мною ў шчырых і сардэчных адносінах. Ён вазіў то аднаго міністра, то другога. Ён проста быў майстар сваёй справы, ціхі і рахманы. Яго "Волга" заўжды была нібы тая лялька — памытая, агледжаная і гатовая ў любую часіну рынуцца па загаду шэфа, хоць на Далёкі Усход...

Я заўжды, пасля прыходу з працы, калі мы сустракаліся ці то ў мяне, ці то ў ягонай кватэры, любіў Мікалая Дзянісавіча. Ва ўсіх ягоных жыццёвых справах была мудрая, глыбокая, гаспадарлівая развага. Мне, чалавеку значна старэйшаму за яго, шмат было ў чым павучыцца, шмат што, як кажуць, наматаць на вус. Мне заўжды прыемныя былі гэтыя сустрэчы з вадзіцелем "Волгі" з нумарам "Мін" (цяпер такіх няма).

І вось нечакана страшэнная вестка. Гэту вестку прынесла, упаўшы грудзьмі на стол, жонка Мікалая Дзянісавіча, медыцынская сястра Тоня: яе муж толькі што пасаджаны ў следчы ізалятар...

— Як? За што?!

Суседка паціснула плячыма.

На хаду зашпільваючы паліто, выскоквае на двор. Хоць ужо красавіцкі вечар, але яшчэ трашчаць лужыны пад нагамі. А ў сэрцы такая маркота: за што так з чалавекам? Няўжо ён, Мікалай Дзянісавіч, заўжды такі спакойны, разважлівы, ад жыцця мудры, мог учыніць нешта такое, каб яго, чалавека ўжо пад пяцьдзесят, маглі ўзяць у нейкі там ізалятар?

Малады следчы, капітан, у сваім службовым кабінеце ўважліва праглядзеў маё пісьменніцкае пасведчанне, сказаў:

— Я па-чалавечы разумею вашы пачуцці да Мікалая Дзянісавіча. Аднак следчая справа ўжо закончана і перададзена ў народны суд.

— Што ж такое мог учыніць Мікалай Дзянісавіч?

— А вось што. Згвалтаваў дзевятнаццацігадовую афіцыянтку...

Закрыты суд вяла даволі маладжавая жанчына. Мікалая Дзянісавіча, абголенага пад турэмную машынку, прывялі ў залу і пасадзілі за "бар'ер", а па баках пасталі міліцыянеры. Суд вынес прыгавор — сем гадоў пазбаўлення волі... Строгага рэжыму...

Тоні ўсе спачувалі. На першы погляд, гаварылі самыя шчырыя, самыя пераканаўчыя словы: з'ехаць з ранейшай кватэры — мяняць на кватэру ў любым мікрараёне, пераводзіць дачушку-другакласніцу ў іншую школу, каб яна нічога не ведала...

Я сустракаўся з Тоняй на лесвічнай пляцоўцы — заўсёды заклапочанай, цікаўнай і заўсёды з адкрытай душой і сэрцам. Яна глядзела на мяне сумнымі вачыма і ўпалым голасам гаварыла:

— Вы — бывалы журналіст, да таго ж пісьменнік... Што параіце мне?

— А як сэрца падкажа, галубка-суседачка...

І сэрца яе падказала — штомесяц ездзіць з важкімі сумкамі ў Казахстан, дзе адбываў пакаранне яе муж. Там ёй дазвалялі ажно цэлы тыдзень быць разам з ім. Там яна была і кухарам, і прачкай, і прыбіральшчыцай. Ён браў у рукі ўсе яе няхітрыя прылады і мяккім цёплым голасам гаварыў:

— Ідзі трошку паляжы. Я тут з усім спраўлюся... Ты ўсё ж думаеш, што я такі?..

Аднаго разу вярнулася ў Мінск — суседкі тут як тут. Вэрхалам наляцелі ў кватэру, сарокамі сакочуць:

— Ты вельмі разумніца, але дурная. Наш савет такі: мяняй кватэру ў другім раёне, каб гэтага сораму не было чутно, каб на дачку, а ўжо слава Богу, у дзевятым класе, цень не падаў...

Яна тады адказала:

— Я ценю за мужам, шаноўныя мае, не бачу. Усё зусім не так, як гэта здаецца, як думаецца...

Вярнуўся Мікалай Дзянісавіч — а ні схуднелы, а ні пабялелы. Такім жа, як і быў раней... А тут — і вяселле: дачушка-студэнтка выходзіць замуж. Муж — лейтэнант інтэрданцкай службы. Толькі скончыў вучылішча і яго накіравалі ў авіяцыйную часць.

На тым вяселлі я быў сватам.

З усіх бакоў гучыць "горка!" І я падтрымліваю гэтыя галасы.

Гарачыя пацалункі як знак вечнай павагі, кахання, вернасці.

Я — вельмі шчаслівы. Мяне за руку, вышэй локця, лагодна цісне Мікалай Дзянісавіч. Побач з ім сядзіць расчырванелая, з жывымі яркімі вачыма ягоная жонка. Шчасліва ўсміхаюцца, гледзячы, як зяць і дачушка танцуюць пад вальс "Амурскія хвалі". І я таксама міжволі ўсміхаюся. Мне лёгка, мне радасна ад таго, што на гэтым белым, мітусліва не зразумелым свеце ёсць такія вось людзі...

Міхась ПАРАХНЕВІЧ.

Парады для жанчын

Зімой, калі не хапае сонца і вітамінаў

Каб захаваць прыгажосць, можна зрабіць такія маскі:

Тварожная маска

Дзве лыжкі свежага тварагу расцерці з сырым жаўтком і дабавіць некалькі кропель перакісу вадароду. Маса павінна быць без камякоў і не зусім густая. Накласці яе на твар і шыю. Праз 10 — 15 хвілін змыць маску халаднаватай вадой, затым спаласнуць твар зусім халоднай вадой. Зімой скура набывае шэраватае адценне, а такая маска ажыўляе яе, робіць святлейшай.

Дражджавая маска

Здрабніць 30 грамаў свежых дражджэй, падагрэць у лыжцы некалькі кропель мёду і перамяшаць з дражджамі. Затым расцерці масу, каб яна не была вельмі густой. Калі скура сухая, дабавіць некалькі кропель аліўкавага алею. Накласці гэтую маску на твар і шыю на 15 — 20 хвілін, затым цеплаватай вадой змыць маску і спаласнуць твар халаднаватай вадой. Дражджавая маска робіць скуру больш пругкай.

Кампрэсы са снегу

Холад захоўвае не толькі харчовыя прадукты, але кансервуе і жаночую прыгажосць.

Уся працэдура займае каля 8 хвілін і дае вельмі добры эфект — скура разгладжваецца, набывае прыемнае ружовае адценне.

Робіцца гэта так. Набраць поўныя прыгаршчы чыстага снегу, высыпаць яго ў сурвэтку, канцы якой закруціць. Сярэднюю частку сурвэткі са снегам вельмі шчыльна прыкладваць да твару і шыі, а таксама на верхнія павекі і падбародак.

Працэдуру гэтую можна рабіць раніцай ці перад сном.

Такія кампрэсы вельмі карысныя.

* * *

Рукі чырванеюць звычайна ад марозу. Можна даць некалькі парад, каб пазбавіцца ад такой непрыемнай з'явы:

1) намачыць рукі ў вадзе, злітай з адварной бульбы;

2) намачыць рукі ў адвары сельдэрэю (сярэдняй велічыні сельдэрэй паварыць у 1 літры вады 1,5 гадзін);

3) рабіць пераменныя ванначкі — то гарачыя, то халодныя.

Каб не абмарозіць рукі, не выходзьце на вуліцу адразу пасля мыцця. Спачатку ўватрыце крыху крэму для рук.

Калі ж усё-такі рукі абмарозіліся, можна выкарыстаць такі крэм: *1/4 частка гліцэрыны, 1/4 — лімоннага соку, 1/4 — аміяку, 1/4 — адэкалону.*

Потым легчы спаць у папяровых пальчатках.

Калі ногі абмарозіліся, можна ўсе працэдуры, якія рэкамендавалі для рук, прымяніць для ног, з той толькі розніцай, што надзенеце не пальчаткі, а шкарпэткі.

Вельмі карысна раніцай абціраць ногі халоднай вадой, а потым расціраць каляным ручніком.

Падрыхтавала Аліна ЯНКОЎСКАЯ.

Галоўны рэдактар Алег КУЛІЦКІ

ЗАСНАВАЛЬНІК — МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Рэгістрацыйны нумар 370.
ДЗЯРЖАЎНАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА "ДОМ ПРЭСЫ". 22 00 13, МІНСК, вул. Б.ХМЯЛЬНІЦКАГА, 10-а

НАШ АДРАС:
220034, МІНСК, ВУЛІЦА ЗАХАРАВА, 42.

Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 36-91-42; першага намесніка галоўнага рэдактара — 36-53-22; намесніка галоўнага рэдактара-адказнага сакратара — 36-40-63; аддзелаў: школ - 36-43-62, праблем выхавання - 36-43-71, 36-90-63; інфармацыі - 36-41-55; ВНУ і тэхнікумаў - 36-44-25; прафтэхадукацыі, пісьмаў і сацыяльных праблем - 36-44-25; культуры - 36-41-55.

Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт), асноўнае месца работы, зваротны адрас, нясуць адказнасць за дакладнасць фактаў і іншай інфармацыі.

Пісьмы, рукапісы, фотаздымкі і малюнкі не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.

Аб'явы могуць друкавацца не толькі на дзяржаўнай, але і на замежных мовах.

Меркаванне аўтараў публікацый не абавязкова адлюстроўвае пункт гледжання рэдакцыі.

Адказны дзяжурны Ала ШАЎЦОВА.

Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку", 220041, Мінск, праспект Ф.Скарыны, 79.
Аб'ём — два друкаваныя аркушы. Спосаб друку — афсетны. Фармат А2. Індэкс 63867.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 Замова №541
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Падпісана да друку 31.1.2001 г. у 18.10
Наклад 30.000 паасобнікаў.